НАША НІВА

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у панядзелкі. №30 (151) 8 ЛІСТАПАДА 1999г.

Пажар у мэтро

У аўторак, 2 лістапада, а 10-й гадзіне раніцы на пад'ездзе да станцыі «Кастрычніцкая» з боку плошчы Перамогі загарэлася нешта ў мэханізьме цягніка мэтро.

Машыніст не адразу надаў увагі таму, што ў салёне пагасла сьвятло, і рушыў далей, да плошчы Незалежнасьці, але ўжо праз 100 мэтраў спыніўся. Людзям давялося пешшу выходзіць назад на станцыю. Сярод іх быў і карэспандэнт «НН». Пад час узгараньня тэрмінова трэ было ачысьціць станцыю ад людзей, але міліцыянтаў на станцыі не аказалася — яны ганялі ў пераходзе мэтро бабулек, што гандлявалі кветкамі. Толькі праз пэўны час ахоўнікі правапарадку заблякавалі ўваходныя дзьверы.

Цікава, што загарэўся цягнік, які толькі тыдзень таму (!) купілі ў Санкт-Пецярбургу. Тут узгадваецца гісторыя тыднёвай даўнасьці, калі ў шэрагу кватэр Партызанскага раёну Менску адбыліся пажары з-за таго, што кляпаны, зробленыя ў Расеі на акцыянэрным таварыстве «Арзамас», ня вытрымалі перападу ціску газу і ўзарваліся. У выніку шмат жыхароў засталіся з абгарэлымі кухнямі і з праломамі ў сьценах.

Вось такі тавар прадаюць нам з Усходу.

Аляксей Стаўпецкі



Сяргей Рымашэўскі. «Ліст»

Станіслаў Шушкевіч: «Я расчараваўся ў камунізме»

Наша гутарка са Станіславам Шушкевічам, які правёў краіну ад камунізму да незалежнасьці, адбывалася ў дзень кастрычніцкай рэвалюцыі, але пачалася з тэмы зусім іншага дня.

Станіслаў Шушкевіч: Нам учора не ўдалося сустрэцца, бо я быў на могілках. Там нас сабралося два сыны і тры дачкі, унукі — да бацькі, дзеда... Для мяне вельмі важна бываць там, ля бацькі. Я хацеў бы быць падобным да яго ў сваім стаўленьні да жыцьця, сяброў, да сытуацыі. І дай Бог, каб я мог вытрымаць, калі трэ будзе вытрымаць тое, што ён вытрымаў...

— Такое можа стацца?

— У нас чалавек цяпер, як у савецкія часы, не абаронены ніякімі законамі, ні судом, усё падпарадкавана адной пэрсоне, для якой хлусьня і непрыстойнасьць — рэчы цалкам звыклыя. Таму мне здаецца, што ніякія агіднасьці ня выключаныя.

— Дзяды і Акцябарскія амаль зьбягаюцца ў нашым календары. Якое са сьвятаў застанецца?

— Ведаеце, у нашай сям'і заўсёды хадзілі на могілкі недзе ў вольны дзень каля першага мая і ў вольны дзень каля сёмага лістапада.

— Першы верш Вашага бацькі быў прысьвечаны памяці Леніна. Чым быў для яго Ленін? Чым быў камунізм?

— І бацька, і маці шчыра верылі ва ўладкаваньне грамадзтва на падставе камуністычнай ідэі. Мая маці таксама напісала першае апавяданьне пра тое, як гэта добра, калі маецца калгасны вялікі сад проці таго, як было раней, калі яе брата ў дзяцінстве нехта пабіў за тое, што ён залез у прыватны сад. Паходзілі яны зь вельмі небагатых сем'яў і сьвята верылі ў камуністычную ідэю. Маці расчаравалася ў ёй — яна памерла ў 1980 годзе, і яе расчараваньне адбылося пасьля таго, як і я расчараваўся ў гэтай ідэі недзе ў сярэдзіне 70-х, зьезьдзіўшы ў Польшчу. Я проста паслухаў там пэўныя выступленьні будучага Папы Рымскага, а тады арцыбіскупа Караля Вайтылы, і пачаў задумвацца над тым, што мы робім і што адбываецца.

А бацька... Бацька, і вярнуўшыся з Гулагу, настойваў на тым, што камунізм — ідэя справядлівая, але выканаўцы дрэнныя, што многа непрыстойных людзей падманам выйшлі ў кіраўнікі і паводзяць сябе ня так, як належыць сябе паводзіць сапраўдным камуністам. Я папрасіў журналістаў азнаёміцца з асабістай справай майго бацькі ў КГБ. Самому мне было нават трохі страшнавата — а раптам натраплю на нейкую цёмную пляму... Аказалася, што мой бацька нікога не заклаў, ні разу не пайшоў супраць сумленьня, хоць, я ведаю, іншыя паклёпнічалі, яшчэ й як. Бацька, дарэчы, іх не абвінавачваў, бо ведаў, якімі катаваньнямі былі вырваныя прызнаньні-нагаворы.

Працяг на старонцы 3.



Агонь астылых сэрцаў

Нядзельная дэманстрацыя ў Менску

7 лістапада, на 82-ю гадавіну кастрычніцкага пераваротy ў Расеі, улады РБ, якія разам зь мясцовымі камуністамі лічаць гэты дзень дзяржаўным сьвятам, імкнуліся вывесьці на цэнтральную плошчу Менску як мага больш народу. Мэта — паказаць, што ў Беларусі ня толькі бэнэфаўцы здольныя вывесьці людзей на вуліцу. Аднак, нягледзячы на ўсе высілкі, акцыя правалілася. Халодны і шэры восеньскі дзень ужо немагчыма сагрэць агнём астылых сэрцаў.

А 9-й раніцы да Кастрычніцкай плошчы пачалі падвозіць «дэманстрантаў» на «Ікарусах». Тут ім раздавалі плякаты, сьцягі і партрэты галоўнага, як цяпер кажуць, камуніста — Лукашэнкі. Менавіта яму належыць нядаўняе прызнанне, што з саюзам трэба сьпяшацца таму, што ўсё меней застаецца людзей старога пакаленьня, якім усё гэта дорага; прагматычная моладзь саюз не падтрымае.

Аднак была на Кастрычніцкім пляцы і моладзь. Школьнікі, якія несьлі сьцягі БССР зялёнай паласой дагары, пры першай магчымасьці сігалі ў двары й зьбягалі дадому. Як яны апынуліся на плошчы?

Макс, навучэнец ПТВ:

— *Падумалі і ўсёй групай прыйшлі на сьвята... Вы зь якой газэты? А-а, тады пішыце праўду: масьцер сказаў, што калі ня прыйдзем, іспыты не здадзім.*

Добраахвотна зьехаліся на плошчу Незалежнасьці толькі вэтэраны камуністычнага руху — чалавек 500. Асобнай калёнай прыйшла калякінская ПКБ.

Вакол плошчы тым часам усе двары напаўняліся грузавікамі з амонам і салдатамі. Улады баяліся, што сьвята ператворыцца ў акцыю пратэсту супраць зьбяднеьня народу.

Усяго да канцовага пункту дайшлі тысяч сем дэманстрантаў. Нягледзячы нават на тое, што проста на плошчы прадавалі танную выпіўку.

Галодныя камуністы Беларусі ўсклалі кветкі да помніка Леніну. А ўжо праз хвіліну зь міліцэйскіх рупараў пачуліся знаёмыя заклікі разыходзіцца, бо ствараюцца перашкоды грамадзкаму транспарту. Расчараваныя «чырвоныя» пабрылі ў бліжэйшыя паркі, дзе й пілі гарэлку за сваё «сьвята кастрычніка», не цураючыся выпадковых мінакоў. Некаторыя камуністы з жалем канстатавалі: «Эх, мала нас стала, не пераплюнулі Марш Свабоды».

На пытаньне «Што для вас камунізм?» некаторыя сьцяганосцы, ужо добра «падагрэтыя», губляліся і не давалі ўцямных адказаў. Казалі: «Усё!» або «Ідэалёгія» або «Ды я за камунізм. Што, дрэнна было? Папсавалі ўсё! Я паўжыцьця лічыўся бясплатна, і дзеці бясплатна лічыліся!..»

Аляксей Шыдлоўскі

Працяг тэмы на старонцы 6.

Нізкая наша палітычная культура

У Беларусі людзі працягваюць абмяркоўваць вынікі 6-га зьезду Беларускага Народнага Фронту, які адбыўся на мінулыя выходныя і выбраў новага старшыню БНФ. Нехта мяркуе, што ў арганізацыі адбыўся трагічны раскол, хтосьці глядзіць на адыход «пазьнякоўскае» часткі Фронту як на натуральную зьяву, ачышчэньне ад састарэлых падыходаў да працы. Сёньня на старонках «Нашае Нівы» ацэнку апошняму зьезду БНФ даюць вядомыя дзеячы беларускай культуры.

Рыгор Барадулін, народны паэт Беларусі:

«Фактычна было два зьезды. І хоць мне не падабаецца любы раскол, ён быў непазьбежны, але ня ў час. Фронт мае быць адзіны, а ён расколаты. Я за адзіны Фронт стаяў, але яго ўжо ня склеіш. Гэта на руку ўладам і КГБ. І без таго дзіўна, што Фронт 10 гадоў трымаўся, у тым часе, калі іншыя арганізацыі здрабнелі. Трэба было адкінуць эмоцыі, але Зьезд паказаў, што ў нас няма палітычнае культуры. Людзі ж, якія займаюцца палітыкай, павінны валодаць элемэнтарнай культурай паводзінаў. А ў нас ізноў усё пераўтварылася ў балаган».

Алесь Пушкін, мастак:

«Я прыехаў на 2-ю сэсію зьезду ад Крупскае суполкі БНФ. Я прыехаў аддаць свой голас за Вінцука Вячорку. Я бачыў ягоную працу, я бачыў акцыю 17-га кастрычніка. Я хачу прафэсіяналізму, каб быць дома і мець сваю палітычную фракцыю ў парлямэнце. 17-га кастрычніка я бачыў тое, што хацеў зрабіць сам. Рэакцыі Зянона Пазьняка на Марш Свабоды не было, ён маўчыць. Я застаўся ў залі, калі выйшлі "вячоркаўцы". Там засталося чалавек семдзесят. І пакуль мы будзем сварыцца, над намі будзе расейскі бот. Калі а 18-й гадзіне ў залю ўвайшла дэлегацыя "вячоркаўцаў", я сказаў бабулькам-сэктанткам: "Давайце застанемся, мы прыехалі нешта рабіць". Я не шкадую, што аддаў голас за Вінцука Вячорку, але са сьпісу ягоных намесьнікаў выкрасьліў Анатоля Фёдарава (бо ён быў злосны й выступіў супраць Зянона Пазьняка, а чалавек зь нянавісьцю не павінен быць у кіраўніцтве) і Юр'я Хадыку (ён першы прапанаваў сысьці дэлегатам з залі, калі там засталіся "пазьнякоўцы"). Я жадаю Фронту плённае працы. Цяпер мы маем права ісьці на больш рашучыя дзеяньні».

Працяг на старонцы 2.

НІЗКАЯ НАША ПАЛІТЫЧНАЯ КУЛЬТУРА

Васіль Сёмуха, перакладчык:

«Я ацэньваю вынікі зьезду, як станоўчыя — Фронт не раскалоўся. Тое, што часам зь яго выходзяць, дык гэта натуральная рэч. Калі гэта здарылася з Пазьняком — шкада. Тым ня меней, Фронт застаўся — і гэта галоўнае. Цешыць, што Фронт памаладзеў. Але ў будучыні таксама будуць бунты: маладыя зноў падрастуць і будуць выстаўляць свае прынцыпы. Дык і добра. Моладзь пайшла за Фронтам — і гэта другое галоўнае».

Мікалай Крукоўскі, мастак:

«У цэлым непрыемная рэч, бо фактычна гэта раскол. Абедзьвюм паловам трэба было захаваць адзінства дзеля галоўнае мэты — адстаяць незалежнасьць і сувэрэнітэт. Галоўнае, каб гэтая мэта не падмянялася грызнёй і штурханінай. Дарэчы, гэткага кшталту выпадкі ўжо былі ў гісторыі — балышавікі й меншавікі. Толькі шкуру незабітага мядзьведзя дзяліць рана. Мяне трохі зьдзіўляе выразна прагляданая мэта прыбраць Пазьняка. А каму ён перашкаджае? Але тут могуць пайсьці абвінавачаньні, і таму нам трэба іх пазьбягаць. Нізкая нашая палітычная культура. Трэба ўлічваць ня толькі тактыку, але й стратэгію. Галоўнае — незалежнасьць. Іншыя мэты — дэмакратыя, дзяржаўны лад — заданьне другараднае».

Юры Хашчавацкі, кінарэжысэр:

«Я ацэньваю вынікі зьезду БНФ, шчыра кажучы, станоўча. Мне падаецца, кожны нацыянальны рух падзяляецца на лібэральную й радыкальную часткі. Напэўна, лібэральная частка больш пэрспэктыўная ў пляне асягненьня сваіх прамежкавых палітычных мэтаў. Мы ня кажам, хто мае рацыю, а хто не. БНФ шмат страціў, калі прапусьціў прапагандысцкія ўдары Замяталіна, скіраваныя на шэраг установак Фронту, і зь ім можна часткова згадзіцца. Палітыка — гэта ня толькі стратэгія, але й тактыка. З тактыкай БНФ ня справіўся. Усе скардзяцца, што цяжка размаўляць пра кааліцыю з БНФ, бо ніколі ня ведаеш, што чакаць. Можна дамовіцца, а заўтра ўсё зьменіцца — няма гарантыі. Патрэбная кааліцыя, бо бяз гэтага няма фронту супольнага супрацьстаяньня камарыльлі Лукашэнкі, а зь імі трэба змагацца. Зь лібэральнаю часткаю БНФ лягчэй размаўляць, і партнэры ў кааліцыі будуць пачувацца ўпэўнена. Шкада, што гэткая сіла, як БНФ, падзялілася; зь іншага боку — будзе больш акрэсьленая пазыцыя і ў адной, і ў другой часткі, тады будзе прасьцей дамаўляцца і з тымі, і з гэтымі. Трэба ўсім увайсьці ў кааліцыю — іншай альтэрнатывы няма».

Валянцін Акудовіч, філёзаф:

«З таго, што я ведаю, вынікі зьезду я ацэньваю станоўча. Сам раскол — гэта дрэнна, але іншых варыянтаў не было. Вячорка абраны большасьцю, а тое, што найбольш інтэлектуальная, жывая й сучасная плынь БНФ нарэшце згуртаваная — гэта сьведчыць на карысьць Фронту й кажа пра ягоную жыцьцёвасьць. Відавочна, што праблема Фронту — гэта праблема кожнага з нас, бо ўсё — пачынаючы ад бел-чырвона-белага сьцяга да беларускае мовы — сканцэнтравана на Фронце. Таму раскалоўся, ці дакладней рэарганізаваўся, ня Фронт, а кожны з нас у сабе ўсярэдзіне перамяніўся. Стала тры Фронты: стары, малады й новы. Наперадзе новы Фронт мусіць, як тое было на Маршы Свабоды, несьці сьцяг Эўрапейскага Зьвязу, а за ім белчырвона-белы. Гэта сымбалізавала б вяртаньне не Беларусі ў Эўропу, а Эўропы ў Беларусь. Стары Фронт патануў у нацыянальшчыне. Цяпер жа больш істотная праблема эканомікі й палітычнага ладу. З новым Фронтам я зьвязваю пэўныя спадзяваньні. Новы Фронт будзе эвалюцыянаваць — паставіць праблему вяртаньня Эўропы ў Беларусь. Другая праблема — уласна беларушчына й незалежніцтва. А стары хай працуе на разьвязаньне старое праблемы».

Уладзімер Колас, дырэктар Беларускага гуманітарнага ліцэю:

«У прынцыпе адбылося тое, што доўга насьпявала й мусіла адбыцца. Штучная аднагалоснасьць на гэта паказвала, але можна было адшукаць цывілізаванае выйсьце. Праца даўно ішла неэфэктыўна. Неабходныя былі перамогі й зьмены. Іх не было, як не было самакрытычнасьці, і панавала нежаданьне прызнаваць свае памылкі. На гэтым зьезьдзе прэцэдэнт самакрытыкі адбыўся, але ня ўсе на гэта пайшлі, і адбыўся раскол. Была пэўная частка гістэрычных людзей, якія ня мелі адказнасьці, і іхная дзейнасьць вяла да выраджэньня арганізацыі. Як далей будзе — цяжка сказаць. Цяпер мы маем клясычную сытуацыю — два народныя фронты. Хочацца, каб Зянон Станіслававіч заняўся аналізам памылак і пралікаў ды аднавіў партнэрскія дачыненьні».

Мікола Купава, мастак:



«Нічога тая й гэтая часткі не атрымалі. Тая частка, што на чале з Пазьняком, імкнулася захаваць адзінства, але гэта не патрэбна было групе, скіраванай на раскол — яны ня чулі іншых. Я не чакаў гэткіх кампрамісаў ад Зянона Станіслававіча. Атрымаўся хутчэй не раскол, а падзел. Гэта натуральна, і мы з часам звыкнемся, што будзе некалькі цэнтраў і лідэраў. Сымптаматычна, што групу Вячоркі пахваліў незалежны палітоляг Фядута, які сказаў, што група Пазьняка будзе занепадаць і таму мусіць далучыцца да "большасьці". Разам з тым нічога трагічнага не адбылося».

Кася Камоцкая, сьпявачка:

«Па-першае, я ніколі не была сябрам БНФ, таму не магу нічога на гэты конт камэнтаваць. Але як з боку гледзячы, дык даўно трэ было падзяліцца й адмежавацца ад замежнага лідэра. Ён ня тое каб псуе рэпутацыю, гэта проста амаральна. У выніку апошняга Зьезду перамагло маладое пакаленьне».

Ніл Гілевіч даваць нам інтэрвію адмовіўся.

Апытваў Віктар Мухін

НОВЫ КІРАЎНІК АРХІВУ — ЗАХАР ШЫБЕКА

На ўчорашнім сходзе заснавальнікаў Фонду «Наша Ніва» абмяркоўвалася сытуацыя ў Архіве Найноўшай Гісторыі, які створаны і працуе пры Фондзе.

У выніку абмеркаваньня быў прызначаны новы дырэктар Архіву. Ім стаў доктар гістарычных навук прафэсар Захар Шыбека. Спадар Шыбека ўзначаліць таксама грамадзкую Раду Архіву. Намесьнікам спадара Шыбекі прызначаны пісьменьнік Уладзімер Арлоў. Новыя кіраўнікі давершаць рэгістрацыю Архіву Найноўшай Гісторыі як самастойнай грамадзкай арганізацыі.

Паўнамоцтвы ранейшага дырэктара Архіву і выканаўчага дырэктара Фонду Алега Дзярновіча страчваюць сілу.

«НН»

навіны зь Беларусі за суботу й нядзелю

І агонь ня вечны

У Бабруйску маюць загасіць вечны агонь пад помнікам вызвольнікам ад фашыстаў, піша БелаПАН. Вечны агонь утрымліваў камбінат «Белшына», у якога цяпер з газам перабоі. Камбінат папрасіў, каб паклапаціліся гарадзкія ўлады, а тым — у Бабруйску ва ўладзе камунякі сядзяць — няма як на гараджанаў газу надаць, ня тое што на вечныя агні.

У Гомелі неспакойна

Камуністы на 7 лістапада зьбіраліся на плошчы Паўстаньня, а самыя адчайныя іх праціўнікі — на вуліцы побач з плошчай Паўстаньня. У 9.15 на іхную групу, выскачыўшы зь мікрааўтобуса, наляцелі шасьцёра ў цывільным і пацягнулі некуды, як сказалі, на гутарку, праваабаронцу Яўгена Мурашку (таго, што за прэзыдэнцкія выбары засудзілі). Празь некаторы час міліцыянты ў форме паспрабавалі забраць у Галіны Арцёменкі (а яна жонка Мурашкі) плякат. Яна не аддавала, дык і яе пацягнулі ў пастарунак. Пры гэтым прысутнічалі ўсе мясцовыя міліцэйскія начальнікі. А 10-й гадзіне на плошчы Леніна арыштавалі анархіста Юрася Глушакова, які разгарнуў плякат «Жыве рэвалюцыя! Сьмерць капіталу!» Сямёра дысыдэнтаў усё ж здолелі прабіцца ў калёну дэманстрантаў і там узьняць лёзунгі: «Расея — турма народаў. В.І.Ленін» і «Свабоду палітвязьням». Ну ж, нядоўга і яны іх пранесьлі. І тых скруцілі, так бы мовіць, «бэпээсэмаўцы». Але здавацца гомельскія дысыдэнты не зьбіраюцца.

Лінг заклікаў Югаславію да дэмакратыі

У Празе засядалі прэм'ер-міністры цэнтральна- і ўсходнеэўрапейскіх краінаў. Нічога ня вырашалі, толькі паабяцалі балканскім краінам помач і падтрымку, а таксама заявілі, што Югаславію возьмуць у свае шэрагі толькі ў тым разе, калі яна неадкладна правядзе дэмакратызацыю. І Лінг пад гэтым падпісаўся.

Пружанскі біг-бэнд

Пружанскі біг-бэнд пад кіраўніцтвам Алега Казея стаў пераможцам фэстывалю эстрадных аркестраў, які ладзіў нястомны Фінбэрг. У аркестры граюць 25 чалавек, і сярод іх няма ніводнага прафэсіянала, затое ёсьць пэнсіянэры, вартаўнікі, беспрацоўныя і нават качагары. Летась аркестру прысвоілі званьне народнага. Выступае ён найбольш у Польшчы. А Казей скончыў Інстытут культуры ў Кулябе — гэта ў Таджыкістане, на бацькаўшчыне ці то справядліва, ці то несправядліва пераабранага ўчора прэзыдэнта Рахмонава.

Можна рыбу нератам лавіць

У Беларусі дазволілі — упершыню за доўгі час — лавіць рыбу сеткамі. Аднак за дазвол трэба плаціць. Раней мужыкі лавілі, але кожны раз пры гэтым парушалі закон. Добра зрабілі: цяпер парушальнікаў стане меней. Хутка мо зробяць як у Італіі, дзе і ў грыбы бясплатна можна хадзіць толькі жыхарам тых вёсак, на землях якіх лес расьце, а як хто чужы, дык мусіць квіток купляць.

Аўстрыйцы ордэн Скарыны зарабілі

Дваім аўстрыйцам наш урад даў ордэны Скарыны: спн.Гайдзі Бургарт і сп.Эрыху Фідэсэру. Бо яны фактычна сабралі грошы (2,8 мільёнаў даляраў) на будаўніцтва комплексу дзіцячай анкалёгіі і гематалёгіі ў Бараўлянах, піша БелаПАН. Уручыў ордэны беларускі пасол у Аўстрыі Валянцін Фісенка ў будынку беларускага пасольства.

Барыс Тумар

Сымбаль інтэграцыі

У Цюмені (Расея) 1-га лістапада гастролямі менскага Малога тэатра распачаліся дні культуры Рэспублікі Беларусі. Арганізатарам імпрэзы выступіла адміністрацыя Цюменскай вобласьці. Гаспадары казалі гучныя прамовы за «союз огромной Россіі і не менее огромной Белоруссіі», мясцовы хор прасьпявў «Беловежскую пущу», мерапрыемства ўшанаваў сваёй прысутнасьцю губэрнатар. Госьці чацьвёрачы паказалі два адрозныя спэктаклі — лубачную «Камэдыю» і эстэцкі «ART», якія былі жыва сустрэтыя сібірскай публікай, асабліва яе беларускаю часткай. Шумным посьпехам карыстаўся расейскамоўны чорт Ігара Забары, «беларускі сымбаль інтэграцыі» — як абазваў яго ў антракце нехта з дасьціпных гледачоў. Дні нашае культуры неўзабаве працягне эстрадны дэсант на чале зь Ігарам Лучанком.

Зьміцер Бартосік

Ураган дапамог

Ураган, які летам прайшоў на Астравеччыне, дапамог лясгасу. Работнікі лесу датэрміновa выканалі плян забесьпячэньня дровамі людзей, што маюць ільготы, і ўсё адно яшчэ ў Міхаліскім лясьніцтве застаецца паваленых каля 50 тысяч кубоў драўніны. Разьбіраюць гэтыя завалы лесьнікі. Працуюць на выезьдзе, наймаючы жытло ў суседніх вёсках.

З Астраўца — Мар'ян Вянгроўскі

Prosim adhuknucca ūsich tych, chto maje zacikaŭlenaść u supolnaje pracy pa stvareńni lićvinskaha kulturnaha kantekstu (raspracoŭcy lićvinskaje histaryjahrafii, udaskanaleńni nacyjanalnaje piśmovaści, movy, adradžeńni lićvinskaha hramadzkaha žyćcia i h.d.), a taksama dla abjadnańnia ū ahulnych karparatyūnych intaresach.
Tel.: (017) 214-2039; pager: (017) 278-1101 ab.6663;
E-mail: litvania@mail.ru albo litvania@europemail.com;
naš sajt: http://come.again.to/ LITVANIA

«МЕЧ У КАМЯНІ», «БАЛТО», «АЛІСА Ў КРАІНЕ ЦУДАЎ», «ПРЫГАЖУНЯ Ў СОННЫМ ЛЕСЕ» — мультыплікацыйныя фільмы, дубляваныя па-беларуску актарамі вядучых менскіх тэатраў.
«ЕХАЎ КАЗАЧНІК БАЙ», «ЦІК-ТАК ХОДЗІКІ», «БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ КАЗКІ», «СТОЙКІ АЛАВЯННЫ САЛДАЦІК + КАЛІФ-БУСЕЛ» — аўдыёкасэты з запісамі казак, калыханак, песьняў для маленькіх беларусаў.
Кошт відэакасэты — 975 тыс. руб., кошт аўдыёкасэты — 400 тыс. руб.
Касэты можна атрымаць, пералічыўшы грошы звычайным паштовым пераказам на рахунак: ЗАТ «Сотвар» р/р 3012000000195 у філіі 506 ААБ «Беларусбанк», код 809. У графе «Для пісьмовага паведамленьня» напішыце, якую касэту Вы замаўляеце.
Менчукі! Зьвяртайцеся на тэл.: 8 (017) 228-45-88.

Станіслаў Шушкевіч: «Я РАСЧАРАВАЎСЯ Ў КАМУНІЗЬМЕ»

Працяг на старонцы 1.

Ворагамі ён лічыў толькі тых, хто добраахвотна, абы захоўваць сябе пры нейкай кармушцы, працавалі ў рэпрэсіўным апараце, выносілі прысуды. Аднаго такога ён сустрэў на вуліцы. Пасьля расшукаў аказалася, што той працуе ў Акадэміі Навук. І мой бацька там такі шурум-бурум падняў, што ад гэтага чалавека мусілі пазбавіцца. Бацька памёр у 91-м годзе 1 лютага. І да скону верыў. Але ён пры гэтым катэгарычна змагаўся з хлусьнёй, з крывадушшам. Ён верыў і ў тое, што Ленін быў такім чалавекам, якім яго малявала камуністычная іканаграфія. Тое, у чым ён быў перакананы, з таго яго зрушыць было немагчыма.

— Але камунізмаў было шмат: расейскі камунізм, беларускі нацыянал-камунізм, украінскі хвылёвізм... У які верыў Ваш бацька?

— Ува ўсіх камунізмаў была адна агульная рыса — гэта ўпэўненасьць у неабходнасьці грамадзкай уласнасьці на сродкі вытворчасьці. Астатняе — дзе, што і як, а вось гэтае было галоўным. Бацька верыў, што на падставе грамадзкай уласнасьці на сродкі вытворчасьці можна пабудаваць прыстойнае грамадзтва. Увогуле, гэта ў традыцыі — паважліва ставіцца да грамадзкай маёмасьці. Мой дзед, дзед Шушкевіч, калі йшоў і на дарозе бачыў камень, дык выходзіў на дарогу і адкідаў яго — бо гэта ж у машыне можа нешта пабіцца ці конь можа нагу зьбіць. Бо гэта ж дарога, гэта належыць усім.

— Вы сказалі, што ў аснове левага руху ў XX ст. было патрабаваньне грамадзкай уласнасьці на сродкі вытворчасьці. А што будзе ў грунце левага руху ў XXI стагодзьдзі?

Я расчараваўся ў камуністычнай ідэі недзе ў сярэдзіне 70-х, зьезьдзіўшы ў Польшчу — паслухаў там пэўныя выступленьні будучага Папы Рымскага, а тады арцыбіскупа Караля Вайтылы і пачаў задумвацца над тым, што мы робім і што адбываецца.

— Мушу ўдакладніць, што лёзунг грамадзкай уласнасьці быў толькі прыкрыцьцём для ўсталяваньня, захаваньня і ўмацаваньня дыктатуры — спачатку гэта называлі дыктатурай партыі, пасьля пралетарыяту, але фактычна гэта была дыктатура найвышэйшых партыйных ерархаў. Прыкрыцьцём для дыктатуры нацыяналістычнай, савецкай ці іншай.

Што павінна быць у левым руху ў XXI стагодзьдзі? Гэта няпростая размова. Калі ўзяць сёньня, напрыклад, праграмы розных беларускіх партыяў, дык убачым, што праграмы лібэралаў, сацыялдэмакратаў і іншых рухаў мала чым адрозьніваюцца. Розьніца толькі ў адным: якая доля валавага ўнутранага прадукту павінна пераразьмяркоўвацца ў грамадзтве, ісьці на сацыяльныя праграмы. Камуністы, ні пра што не клапоцячыся, апроч сваёй улады, заўсёды сьцьвярджалі, што гэта павінна быць вельмі вялікая доля. Лібэралы кажуць, што калі не стварыць умоваў для вольнай канкурэнцыі, запаволіцца разьвіцьцё грамадзтва. Правая сацыял-дэмакратыя, у тым ліку й наша Грамада, лічыць, што бюджэтнаму пераразьмеркаваньню мусіць падлягаць такая частка валавага ўнутранага прадукту, якая б не тармазіла разьвіцьцё грамадзтва, ня стрымлівала рост эканомікі. Галоўны крытэр таго, што грамадзтва добра разьвіваецца — паказчык росту валавага ўнутранага прадукту на душу насельніцтва. Польшча ўяўляе вялікі прыклад супрацоўніцтва лібэральных ідэяў Бальцаровіча і сацыял-дэмакратыі. Пры гэтым адбываецца карэкцыя лібэральных ідэяў у бок пабудовы капіталізму, кшталту таго, які існуе ў Швэцыі. У адрозьненьне ад Расеі, дзе ўзьнік алігархічны капіталізм.

— У Польшчы існуе нацыянальны кансэнсус па прынцыповых пытаньнях — арыентацыя на NATO і Эўразьвяз, павага да прыватнай уласнасьці і капіталістычныя рэформы. У нас нацыянальнага кансэнсусу не прадбачыцца. Ці — прадбачыцца ўсё ж?

— Расейская імпэрыя, расейскія шавіністы шмат пастараліся, каб такога кансэнсусу не магло ўзьнікнуць ні ў той Польшчы, ні ў нас у Беларусі. У нас ім удалося лепш. Бо хто ёсьць творцам нацыянальнага кансэнсусу і носьбітам нацыянальнай традыцыі? Нацыянальная інтэлігенцыя, эліта грамадзтва. Беларускую эліту вынішчылі цалкам. Першае вынішчэньне адбылося ў XIX стагодзьдзі пасьля вызвольных паўстаньняў, якія былі перадусім беларускімі паўстаньнямі — бо Каліноўскі такі самы паляк або літовец, як я кітайскі імпэратар. Другое вынішчэньне правёў камуністычны рэжым, і яно з усёй нашай пішучай інтэлігенцыі — пісьменьнікаў, навукоўцаў, філёлягаў — не закранула хіба што 7 чалавек. Беларускі дасьледчык Леанід Маракоў зрабіў цікавыя параўнальныя дыяграмы, грунтуючыся на зьвестках зь беларускіх і расейскіх архіваў. У 30-х гадах у Беларусі, Украіне й Расеі доля творчай, пішучай інтэлігенцыі ў працэнтах ад усяго насельніцтва была прыкладна аднолькавай. Пад час рэпрэсіяў жа і ў нас, і ва Ўкраіне, і ў Расеі загінула прыкладна па 400 прадстаўнікоў пішучай інтэлігенцыі. Але калі для Расеі гэта была невялікая частка ўсіх, дык у нас амаль усе да аднаго. Каму ж было адстойваць гэтую мову і гэтую традыцыю? Вось чаму няма каму супрацьстаяць тым псэўдаінтэлігентам-недавукам, што служылі і служаць уладзе, уводзячы людзей у зман. Між тым, часта ў нас — і Ваша газэта гэта часта сабе дазваляе — абвінавачваюць народ, што гэта ён такі несьвядомы, што ён не трымаецца сваёй мовы і нацыянальнай традыцыі, што даў ажыцьцявіцца дзяржаўнаму пераваротy, антыбеларускаму па сваёй сутнасьці.

— Лукашэнка — левы ці правы?

— Ён увогуле левы, але спытайцеся ў яго, у чым адрозьненьне паміж левымі й правымі, ён Вам ня скажа. Спытайцеся ў яго, адкуль паходзяць гэтыя тэрміны — «левы» і «правы», ён ня скажа. Ён ня мае ўяўленьня пра палітычныя ці эканамічныя лады. Ён прымітыў, і імкнецца праводзіць простую па сутнасьці палітыку. Але грамадзтва цяпер такое, што ня можа быць прымітыўных рашэньняў. У гэтым драма Беларусі. Ёсьць няпростыя рашэньні ў эканоміцы і вельмі няпростыя ў палітыцы, але такія рашэньні здольныя прымаць толькі добра падрыхтаваныя людзі.

— Беларусь часта называюць «запаведнікам камунізму». Калі злучыць «запаведнік камунізму» і алігархічную Расею, што атрымаецца?

— Пры ідэалягічных аб'яднаньнях звычайна атрымліваецца, што атрыманае ўтварэньне насьледуе найгоршыя рысы тых, што аб'ядноўваюцца. Цяперашняе аб'яднаньне Расеі зь Беларусяй накіраванае на захаваньне ўлады чалавекам, які прывёў Беларусь да крызысу. Прадуманае аб'яднаньне, напрыклад, аб'яднаньне Эўропы, адбываецца зусім на іншым грунце.

— Вы былі дэлегатам апошняга зьезду Камуністычнай Партыі Беларусі. Чым для Вас застаўся гэты зьезд?

— Тое, што я быў дэлегатам, было ў пэўным сэнсе выпадковасьцю. Мяне не вылучала ні партыйная арганізацыя ўнівэрсытэту, ні сыстэмы Міністэрства вышэйшай адукацыі. Мяне вылучылі ў канструктарскай арганізацыі, дзе я некалі выступаў — нават не прыгадаю цяпер, як называлася гэтая арганізацыя. Там працавалі сапраўдныя інтэлігенты, на той сустрэчы яны мне задавалі вельмі цікавыя пытаньні — і вось перад зьездам я даведаўся, што яны мяне вылучылі дэлегатам.

Я ня быў чалавекам, які адчуваў у 1989 годзе, што СССР праз год-два перастане існаваць. Стаўшы народным дэпутатам, я меў надзею, што мы ўпарадкуем гэтую сыстэму, што мы створым канфэдэрацыю. Я ў дарозе фармаваўся. Калі я быў на XXXI зьезьдзе дэлегатам, я шчыра думаў, што можна зрабіць праз гэтую арганізацыю, якая мае ўладу, якая мае структуру, каб жыцьцё наша стала больш людзкім і больш беларускім. Я лічыў, што трэба, каб у нас была беларуская камуністычная партыя, а не партыйнае аддзяленьне КПСС. Фактычна, гэта было ў нас галоўнае пытаньне на XXXI зьезьдзе КПБ, гэта было тое, чаго я дабіваўся. А што датычыць выбараў кіраўнічых органаў, я не падтрымліваў партыйных інтэлектуалаў, бо ведаў іх здрадніцкі характар. Не хачу называць прозьвішчы.

— Вам асабіста і нацыянальна-дэмакратычным сілам увогуле ўдалося шмат чаго дабіцца ў справе пабудовы дзяржаўнасьці на пачатку 90-х. Як Вы лічыце, ці ўдалося б зрабіць столькі ж, каб на XXXI зьезьдзе КПБ перамаглі не памяркоўныя, а артадоксы на чале з Бровікавым?

— Я думаю, гэта ніяк бы не паўплывала на сытуацыю. Той зьезд паказаў, што палова партыі выступае за тое, каб ісьці да беларускай дзяржавы. Я ведаў Бровікава з даўніх часоў. Ён быў сапраўдным інтэлектуалам, вельмі адукаваным чалавекам, але, на жаль, абсалютна антыбеларускім дзеячом, цалкам перавыхаваным Масквою.

— Хто зь беларускіх камуністычных кіраўнікоў зрабіў дабро для Беларусі?

— Лепшыя беларускія кадры забіралі ў Маскву, і калі яны й вярталіся, дык вярталіся вернымі эмісарамі Масквы, а тут рыхтаваліся кадры, якія верна выконвалі ўсё, што ім загадвалі. У тым ліку Машэраў, калі паглядзець, мала дбаў пра нацыянальныя інтарэсы. А вось Міхаіл Кавалёў, старшыня ўраду, пра якога цяпер згадваюць нячаста, у любых пытаньнях, аж да вывазу беларускай сельгаспрадукцыі, упарта адстойваў нашы інтарэсы і нават дазваляў сабе не падпарадкоўвацца нейкім загадам з Масквы.

— А чыя заслуга ў тым, што ў Менску паставілі помнікі класыкам беларускай літаратуры?

— Ня ведаю, чыя гэта заслуга, але лепшым помнікам Якубу Коласу было б тое, каб ягоная ўнучка магла пайсьці ў беларускую школу, а яна такой магчымасьці за Машэрава ня мела і цяпер ня мае. Або каб збор твораў Янкі Купалы быў выдадзены ў поўным выглядзе, а не без 70 твораў, як у тыя гады. «Табе, правадыр, нашы песьні і думы І шчырага-шчырага сэрца парывы» ня выкінулі, а найважнейшыя творы-выразалі.

— Якія з гаспадарчых праектаў камуністычнай эпохі Вы ацэніце як карысныя для Беларусі?

— Вельмі цяжкім грузам вісяць на нас цяпер машынабудаўнічыя гіганты, якія паціху канаюць і вельмі цяжка рэфармаваць. У той жа час мэліярацыя, я лічу, была вельмі карыснай інвэстыцыяй. Удалым праектам была мазырская і наваполацкая нафтаперапрацоўка, але цяпер абсталяваньне гэтае ўжо састарэла. У нас няма высокатэмпэратурнага крэкінгу, і выхад сьветлых нафтапрадуктаў малы.

— Адам Міхнік неяк сказаў: «Змагаючыся з камунізмам, мы й ня ведалі, якія пачвары павылазяць пасьля ягонага падзеньня». Ці датычыць гэта нашага грамадзтва?

— Мы пра гэта ня раз гаварылі з Адамам. Я тут заўважу трохі іншае. Да ўлады ў нас прыйшлі людзі мала дасьведчаныя ў эканоміцы і палітыцы. Іх рашэньні не абгрунтаваныя навукай. Прыкладам, Лукашэнка дамагаецца аб'яднаньня з Расеяй, але робіць гэта фактычна толькі для захаваньня ўласнай улады, а не для карысьці Беларусі.

— Якім мусіць быць наступны Марш Свабоды?

— Я належу да тых людзей, якія больш дабіваюцца дзеля абароны нашай незалежнасьці па сваіх каналах, а не на вуліцах. Але я прайшоў першым Маршам ад пачатку да канца, ад Якуба Коласа да Пуліхава. Я хацеў бы толькі нагадаць некаторым ягоным арганізатарам, што калі вы вядзеце людзей наперад, дык мусіце й самі ісьці ў першым шэрагу. Як гэта робіць, напрыклад, дэпутат Шчукін.

— Шчукін для Вас — сапраўдны камуніст?

— На маю думку, ён прыстойны чалавек з уласнымі поглядамі, але гэтыя погляды не абгрунтаваныя ні сапраўднай тэорыяй, ні жыцьцёвай практыкай. Ён па-свойму змагаецца за правы чалавека і свабоду свайго народу.

Мой дзед, дзед Шушкевіч, калі йшоў і на дарозе бачыў камень, дык выходзіў на дарогу і адкідаў яго — бо гэта ж у машыне можа нешта пабіцца ці конь можа нагу зьбіць.

— Адна з кніг Вашага бацькі называецца «Казёл на верталёце». Дык калі ў яе зноў зьявіцца шанец быць перавыдадзенай?

— У майго бацькі была іншая кніга — «Зьвярыны баль», яшчэ даваенная, у якой апісваецца, як добрыя, пачцівыя зьвяры скідаюць тырана-лява і балююць ад радасьці. Гэтак будзе і ў нас. Толькі б не прыйшла пасьля з трэцяй бацькавай кнігі «Ліса з магнітафонам».

Гутарыў Андрэй Дынько

КАРАЛЕЎСКАЕ РЭГБІ

У валійскім горадзе Кардыфе скончыўся чэмпіянат сьвету па рэгбі. У фінальным матчы аўстралійцы перамаглі французаў 35:12. Асабліва вылучыўся аўстраліец Мэт Бэрк, які забіў штрафны зь мёртвага кутка, пераламіўшы бег матчу. Упершыню за 12 гадоў зборная заваявала сусьветны трафэй другі раз запар. Рэгбі надзвычай папулярнае ў краінах былой ангельскай імпэрыі — нават малыя Фіджы ды Тонга бяруць чынны ўдзел у найвышэйшых сусьветных спаборніцтвах.

За рэгбі сачыла сама ангельская каралева — бо ў аўстралійцаў у кутку сьцяга з зорным Паўднёвым Крыжом знаходзіцца ангельскі Union Jack. Але відаць было, што каралева нудзіцца. Цымус жа ў тым, што адначасова зь фінальным матчам у Аўстраліі праходзіў рэфэрэндум, які меў вызначыць, ці стане краіна рэспублікай, ці застанецца пад фармальным патранажам ангельскай кароны. Рэфэрэндум закончыўся даволі ўпэўненай перамогай манархістаў — яны сабралі 54,6% галасоў.

Каралева Элізабэт перад тым рахмана заявіла, што прыме любы вынік аўстралійскага рэфэрэндуму і падпарадкуецца яму. А і праўда? На халеры ёй тая Аўстралія!? Што зь яе — ні пуху, ні пер'я. Ёй хоць бы сынам рады даць. Адного жаніць, другога разьвесьці, а трэці, разьведзены, хоча ізноў жаніцца.

А ў Аўстраліі на наступным тыдні пачынаюць новы этап бактэрыялягічнай вайны проці трусоў, бо яны ўсю траву выядаюць. Завезьлі з Эўропы вірус, ад якога трусы гінуць, прышчапілі яго аўстралійскім грызунам і выпускаюць у палі, каб разносілі. Прыродаабаронцы пратэстуюць, абарыгены таксама. Абарыгены толькі трусяцінаю і жылі: выкурвалі зьвяркоў з нораў, мяса елі, а шкуркі ў нарыхтоўчыя канторы здавалі. Калі ж трусоў патруцяць, дык і абарыгенам працаваць прыйдзецца.

Б.Т.

Фота AP

ПРАЕКТ СТАГОДЗЬДЗЯ

На мінулым тыдні ў менскім Палацы Мастацтваў зачынілася мастацкая акцыя Сяргея Войчанкі і Ўладзімера Цэсьлера «Праект стагодзьдзя».

Сяргей Войчанка і Ўладзімер Цэсьлер — вядомыя творцы рэклямнага мастацтва, што шматразова даказалі сваімі выдатнымі творамі і перамогамі на ўсіх магчымых конкурсах. Але пры ўсёй павазе перад знанымі мэтрамі схіляюся да думкі, што ўбачанае — гэта больш самарэкляма, чым «Праект стагодзьдзя», пра што сьведчыць выкарыстаньне ўсіх магчымых сродкаў прамоцыі – амбіцыйная назва, спэкуляцыя сусьветна вядомымі імёнамі, транспаранты, эфэктны плякат і г.д. Зьдзівіла і ўразіла татальная прысутнасьць спонсараў, рэклямныя транспаранты якіх бадай упершыню прысутнічалі непасрэдна ў выставачнай залі, а фірмовы чырвоны колер аўтары, відаць, каб максымальна прагнуцца, вывелі на подыюмы, дзе дэманстраваліся творы, вытанчаныя кампазыцыі якіх ён адназначна не пасаваў. Чырвоны колер спонсараў, якія, магчыма, пашкадавалі грошай на арэнду больш адпаведнай для камэрных твораў залі ці на больш адэкватную арганізацыю існуючай прасторы.

Што датычыць канцэпцыі, то акцыя выглядала як рэфлексія «абарыгенаў» пра тое, што зроблена ў «вялікім сьвеце». Тады як падбор пэрсаналіяў (сярод якіх Жан Тынгелі, Франс Мазарэль, Іосіф Бродзкі, Эндру Ўайт, Гюнтэр Юкер ды іншыя) ажыцьцяўляўся не паводле прынцыпу прынцыповай суб'ектыўнасьці, як сьцьвярджаюць аўтары, а паводле таго, чые дасягненьні і асобы мелася магчымасьць адлюстраваць з максымальным візуальным эфэктам.

Дзяніс Раманюк

дзе варта быць

«Унія»

Дзе гэта прапаў мужчынскі камэрны хор «Унія» пасьля выданьня кампакту «Беларускія маршы і песьні»? Вось жа не прапаў. Будзе ягоны канцэрт у **менскім ДК Дзяржынскага (у будынку КГБ)**. І сьпяваць будуць беларускія і амэрыканскія народныя, а таксама бітлоўскія песьні. Адно шкада, што трэба пачакаць, бо адбудзецца канцэрт не на гэтым тыдні, а 24 лістапада. Зрэшты, лепей даведацца раней, каб пасьпець з квіткамі.

Сэмінары

15 лістапада, у наступны панядзелак, з 14-й да 17-й «Аб'яднаны шлях» праводзіць сэмінар для грамадзкіх арганізацыяў на тэму «Ліквідацыя грамадзкіх аб'яднаньняў і іх арганізацыйных структураў» з удзелам прадстаўніка Мінюсту Міхаіла Сухініна. Адрас: Менск, вул.Уральская 3, актавая заля на 3-м паверсе (падымацца лесьвіцаю зь левага боку). Рэгістрацыя 13.20—13.55. Хто не прайшоў перарэгістрацыю, сьпяшайцеся. Бо калі будуць ліквідоўваць сілком — мала не падасца.

Дактары

У суботу 13 лістапада а 10-й у аўдыторыі 1-га корпусу 1-га Мэдуніверсытэту адкрыецца канфэрэнцыя «Мэдычная асьвета ў Беларусі». Зьбяруцца практычна ўсе беларускамоўныя дактары. А такіх нямала.

Прэзэнтацыя

Беларускі Калегіюм ладзіць чарговую прэзэнтацыю. На гэты раз — да 10-х угодкаў часопіса «Спадчына». Выступяць галоўны рэдактар Вячаслаў Ракіцкі ды іншыя. Гэта будзе, як заўжды, у аўторак, 9 лістапада, у 18.30 (бібліятэка імя Янкі Купалы, вул. Харужай 16).

Тэатар

У Купалаўскім:

8 лістапада — драма Р.Гарвуда «Касьцюмер»;

10-га — народная драма «Страсьці па Аўдзею (Крык на хутары)»;

11-га і 12-га — «Вечны Фама», камарыльля ў дзьвюх дзеях паводле «Сяла Сьцяпанчыкава і яго-ных жыхароў» Ф.Дастаеўскага;

13-га — пастараль М.Маханіна «Парфён і Аляксандра»;

14-га — камэдыя М.Задорнава «Таполевая завея».

Для тых, хто заняты ўвечары, 14 лістапада тэатар прапануе ранішні спэктакаль (пачатак у 11.30) — «Паўлінку».

На Малой сцэне Купалаўскага 8 лістапада можна паглядзець трагікамэдыю А.Фугарта «Тут жывуць людзі», а 12-га — «Крывавую Мэры», вечаровы кактэйль у адной дзеі, створаны Зьмітром Бойкам.

На «Вольнай сцэне»:

9 лістапада — трагіфарс Б.Брэхта «Ўзьлёт Артура Ўі, які можна было спыніць»;

10-га і 14-га — эклектычная камэдыя Ж.-Б.Мальера «Лекар паняволі»;

11-га і 12-га — «Стомлены д'ябал» — фантасмагорыя С.Кавалёва;

13-га — гульні дарослых пад назваю «Містэр розыгрыш», вынайдзеныя С.Кандрасюком.

У Тэатры лялек:

9, 10, 24, 25 лістапада а 17-й — прэм'ера спэктаклю «Гансэль»;

11, 16, 17 у 10.30 ды 12.30 — прэм'ера «Кот у ботах».

У Тэатры юнага гледача:

9 ды 10 лістапада — прэм'ера «казкі для разумных ды дарослых дзяцей» «Сястра мая Русалачка» паводле Л.Разумоўскай;

13 лістапада на спэктаклі «Шчасьлівыя жабракі» можна будзе пасьмяяцца ня толькі з пэрсанажаў п'есы, але і з уласнага гаротнага жыцьця.

Опэра

9-га — «Князь Ігар» А.Барадзіна;
11-га — «Травіята» Дж.Вэрдзі;
13-га — «Візыт дамы» С.Картэса;
14-га — дзіцячая п'еса Ц.Кюі «Кот у ботах».

Балет

10-га — «Спартак» А.Хачатурана;
12-га — «Жарсьці» («Рагнеда») А.Мдзівані;
14-га — «Жызэль» А.Адана.

Філярмонія

Калі Вы жадаеце, каб Вашыя дзеці (і Вы самі зь імі) зразумелі ды ўпадабалі клясычную музыку, завітайце 14 лістапада а 16-й у Філярмонію **«На канцэрт усёй сям'ёй»**. Мастацтвазнаўца А.Парэцкі пазнаёміць вас з клявэсінам, арганам, раялем ды сынтэзатарам.

У Залі камэрнай музыкі 13 лістапада з 16 гадзіны будзе гучаць **французская арганная музыка** ад эпохі барока да «Залатога веку» ў выкананьні Канстанціна Шарава.

Выставы

Нацыянальны мастацкі музэй, хоць і бракуе грошай, усё ж пашырае сваю калекцыю. Каб пабачыць творы, якія былі набытыя ў фонды музэю ў 90-я гады, завітайце на выставу «На мяжы тысячагодзьдзяў. Беларускае мастацтва».

У галерэі візуальных мастацтваў NOVA, што ў бібліятэцы імя Янкі Купалы, часьцяком ладзяцца цікавыя фотавыставы. Апошнім часам там неяк больш выстаўляліся замежнікі, а цяпер — зноў беларусы. Да 27 лістапада ў галерэі працягваецца выстава сучаснай беларускай фатаграфіі «Там і тады».

А ў выставачным павільёне «Асунта» на Нямізе 30, 9—12 лістапада ідзе выстава зусім іншага кшталту. Завецца яна «Беларускі дом». На ёй вы пабачыце будаўнічыя матар'ялы, вокны, дзьверы ды ці мала чаго іншага. Выстава міжнародная.

У Вільні

9 лістапада а 10-й у віленскім Пэдагагічным унівэрсытэце адбудзецца прэзэнтацыя новай кнігі Ўладзімера Арлова ды Генадзя Сагановіча **«Дзесяць вякоў беларускай гісторыі»**. Разьдзелы з гэтага выданьня знаёмыя чытачам беларускай незалежнай прэсы. І вось нарэшце цалая кніга. Выйшла яна ў Вільні, у выдавецтве «Наша Будучыня», бо ў Менску не «прайшла» ў дзяржаўных выдавецтвах. Віленскія ж выдаўцы і запрасілі аднаго з аўтараў, Уладзімера Арлова, на сустрэчу зь беларускім студэнцтвам і тутэйшымі журналістамі. Кажуць, і сама кніга там будзе прадавацца. З аўтографам.



Фота

Дакумэнтальная фотавыстава Нямецкага культурнага цэнтра імя Гётэ **«Нямеччына ад 1945. Погляд трох пакаленьняў адной сям'і»**. Адкрыцьцё адбудзецца 11 лістапада а 17-й гадзіне. Выстава працуе з 12 да 25 лістапада ў Музэі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр. Скарыны, 47). 50 гадоў нямецкай гісторыі, убачаныя трыма пакаленьнямі сям'і Клар.

А.К.

ІНФАРМАЦЫЯ ДЛЯ ЧЫТАЧОЎ У МЕНСКУ

Каб чытаць сьвежы нумар «НН» у дзень выхаду – у панядзелак – і пры гэтым эканоміць час і грошы, аформіце падпіску ў бліжэйшым шапіку «Белсаюздруку», а атрымліваць газэту можна ў любым менскім газэтным шапіку.

Зь ліпеня 1999 г. падпіску «да запатрабаваньня» прымаюць 32 газэтныя шапікі. Менскі «Белсаюздрук» гарантуе выдачу газэты па падпісным абанэмэнце ў дзень выхаду газэты, а таксама захаваньне не забраных вамі асобнікаў праз увесь падпісны пэрыяд.

Кошт падпіскі на «НН» на месяц (з кастрычніка) – **192 000** руб. (4 нумары ў месяц, газэта выходзіць на 12 старонках). Падпіска «да запатрабаваньня» прымаецца да 23 дня перадпадпіснога месяца ў крамах і шапіках «Белсаюздруку» г. Менску. Даведацца і высьветліць няясныя пытаньні можна па тэл. 227-88-41 у спадарыні Натальлі Сьвятохі.

Звычайная падпіска па краіне на IV квартал 1999 году:
Кошт на 1 месяц - 212 000 рублёў, на 3 месяцы - 636 000 рублёў.

НАША НІВА

Ніжэй мы падаем сьпіс пунктаў, дзе можна падпісацца й забіраць газэту:

1. Кастрычніцкі пункт падпіскі,	вул. Жукоўскага, 5, к. 1	26. Крама № 24	вул. Жылуновіча, 31
2. Партызанскі пункт падпіскі,	вул. А.Кашавога, 8	27. Шапік № 34	гатэль «Менск», пр. Ф.Скарыны, 11
3. Першамайскі пункт падпіскі,	пр. Ф.Скарыны, 113	28 Шапік № 136	ст. м. «Плошча Якуба Коласа»,
4. Фрунзенскі пункт падпіскі,	вул. Рам. Слабада, 9		выхад да Акадэміі Фізкультуры
5. Крама № 1	вул. Жукоўскага, 5	29. Шапік № 187	гатэль «Беларусь», вул. Старажоўская, 15
6. Крама № 2	пр. Ф.Скарыны, 44	30. Шапік № 262	гатэль «Плянэта», пр. Машэрава, 31
7. Крама № 3	пр. Ф.Скарыны, 76	31. Шапік № 78	гатэль «Юбілейны», пр. Машэрава, 19
8. Крама № 4	вул. Леніна, 15	32. Крама №25	вул. К.Маркса, 21
9. Крама № 6	вул. Філімонава, 1	33. Шапік №2	Лінгв. унів-т, вул. Захарава, 21
10. Крама № 7	вул. Якуба Коласа, 69	34. Шапік №16	Гатэль «Сьвіслач», вул. Кірава, 13
11. Крама № 8	вул. Сурганава, 40	35. Шапік №18	Тэхн. унів-т, вул. Сьвярдлова, 13/4
12. Крама № 9	пр. Ракасоўскага, 140	36. Шапік №37	Дом Ураду, вул. Савецкая, 11
13. Крама № 10	вул. Асіпенкі, 2	37. Шапік №38	Педаг. унів-т, вул. Савецкая, 18
14. Крама № 11	пр. Пушкіна, 77	38. Шапік №40	Мемгарвыканкам, пр. Ф. Скарыны, 8
15. Крама № 12	вул. Кіжаватава, 80	39. Шапік №88	Менаблвык-м, вул. Энгельса, 4
16. Крама № 13	вул. Каліноўскага, 82, к. 2	40. Шапік №95	вул. Мясьнікова, 39
17. Крама № 14	вул. Валадарскага, 22	41. Шапік №198	Эканамічны унів-т
18. Крама № 15	вул. Танкавая, 16	42. Шапік №209	МАЗ, вул. Сацыялістычная, 2
19. Крама № 16	вул. В.Харужай, 24	43. Шапік №228	Унів-т культуры, вул. Рабкораўская, 17
20. Крама № 17	вул. Някрасава, 35	44. Шапік №232	МЗХ, пр. Машэрава
21. Крама № 18	ст. м. «Плошча Перамогі»	45. Шапік№243	Саўмін, вул. Савецкая, 9
22. Крама № 19	пр. Машэрава, 51, к. 1	46. Шапік №245	Бальніца хут. дапамогі, вул. Кіжаватава, 56
23. Крама № 20	вул. Ясеніна, 16	47. Шапік №298	пр. Машэрава, 75/1
24. Крама № 21	станцыя мэтро «Пушкінская»	48. Шапік №302	9-я бальніца
25. Крама № 23	вул. Славінскага, 39		

ПАДПІСНЫ ІНДЭКС 63125

ЧАЧЭНІЯ: ПРАЦЯГ ГЕНАЦЫДУ

Расейскія СМІ перадалі са спасылкаю на вайскоўцаў, што за мінулыя выходныя было зьнішчана 120 чачэнцаў і 20 іхных аўтамашынаў. Агенцтва АР тымчасам удакладняе, што ў суботу у выніку шматразовых бамбаваньняў жылых кварталаў Грознага, былі забітыя 32 мірныя жыхары. Сярод іх 8 малых дзяцей і 12 кабетаў. Налёты авіяцыі расейцаў узнаўляліся кожныя дзьве гадзіны. На сёньня Чачэнію пакінула 195 тыс. чалавек. Зьбольшага яны ўцяклі ў Інгушэтыю, насельніцтва якое складае ўсяго блізу 400 тыс. чалавек...



Шаміль Басаеў

Чачэнскае кіраўніцтва літаральна ўзмалілася да сусьветнае супольнасьці з просьбаю спыніць чарговы генацыд чачэнскага народу. Прэзыдэнт Чачэніі Масхадаў зьвярнуўся ўжо і да Папы Рымскага, да ААН і Злучаных Штатаў. Днямі ў сталіцы арабскае дзяржавы Катар — Досе — перад урадоўцамі мусульманскіх краінаў выступіў прадстаўнік чачэнскага прэзыдэнта Зэлімхан Яндарбіеў з просьбаю аб дапамозе...

Але прэм'ер Расеі Пуцін учора заявіў, як паведамляе агенцтва Інтэрфакс, што гэтыя звароты Масхадава да сусьветнае супольнасьці несур'ёзныя. Больш за тое, кіраўнік расейскага ўраду даўмеўся сказаць у Маскве свайму калегу з Турцыі, сп.Эджэвіту, што ён спадзяецца «на спрыяньне міжнароднай супольнасьці і ў першую чаргу, ісламскага сьвету». Бо, на ягоную думку, гэта ніякая не агрэсія, а вынішчэньне чачэнцаў будзе спынена, як толькі «бандыты» кінуць супраціў... Турэцкі прэм'ер ніяк гэтыя шчырасьці не пракамэнтаваў. Усё ж у гасьцях.

Аднак міжнародная супольнасьць не маўчыць. Кіраўнік нямецкага МЗС Ёшка Фішар назваў дзеяньні расейскае ваеншчыны на Каўказе «страшнай памылкаю». З рашучым пратэстам і з просьбаю аб літасьці зьвярнуўся да ўраду Расеі прэм'ер Вялікае Брытаніі Тоні Блэр. А заўчора з рэзкай крытыкай на адрас расейскіх агрэсараў выступіў намесьнік дзяржсакратара ЗША, Строўб Тэлбат. Падобна, што нармальны сьвет пачынае губляць цярпеньне. Забойствы мірных жыхароў ня маюць апраўданьня. А мэтадычны паўтор гэткіх злачынстваў завецца генацыдам. І расейцы могуць неўзабаве апынуцца ў ізаляцыі. Хаця поўнай ізаляцыі ня будзе. Бо маюць добрых сяброў у Бялградзе і ў нас у Менску.

З.Я.

ПЕРАДУСІМ ТРЭБА ВЕРЫЦЬ

31 кастрычніка каталіцкая й лютаранская цэрквы падпісалі супольную дэклярацыю аб згодзе, паставіўшы кропку ў паўтысячагадовай спрэчцы.

Сьвятарства з Сусьветнае фэдэрацыі лютаранаў ды Рыма-каталіцкае царквы адслужылі супольную імшу ў бажніцы Сьвятой Ганны, што ў нямецкім горадзе Аўгсбургу. Перад тым быў падпісаны ўнікальны дакумэнт — Дэклярацыя дактрыны апраўданьня.

Дактрына, паводле якое можна дамагчыся ратаваньня душы, была падставаю для Рэфармацыі, якую распачаў колішні дамініканскі мніх Марцін Лютар. Рэлігійны рух, які ён ачоліў, ператварыўся ў рэвалюцыйны. І, як за кожнай рэвалюцыяй, прыйшла вайна, што пацягнула за сабою падзел Эўропы, з-за чаго народы ваявалі 30 гадоў. «Лютрам» беларусы ў старасьвеччыну звалі д'ябла.

А пачалося ўсё з таго, што 31 кастрычніка 1517 году, у нядзелю, нямецкі мніх Лютар прыбіў да дзьвярэй царквы ў Вітэнбэргу свае славутыя 95 тэзысаў, у якіх гаварылася найперш пра тое, што толькі адна вера ўратуе чалавечую душу, а ня добрыя справы з намерамі. У той час каталіцызм прытрымліваўся дактрыны, што не адна вера, але й добрыя ўчынкі могуць ачышчаць душу, якая мкнецца да збавеньня.

І вось амаль праз 500 гадоў дыскусіі скончыліся. Агульная Дэклярацыя здымае ўзаемныя праклёны й анатэмы, пасланыя каталікамі й лютаранамі адзін супраць аднаго з XVI стагодзьдзя. Дэклярацыя канстатуе, што абедзьве царквы пагадзіліся на тым, што апраўданьне даецца толькі з Божае Ласкі і, перадусім, празь веру ў Ісуса Хрыста.

Атрымліваецца, Лютар меў рацыю? У новым дакумэнце не сказана, што зьнятыя ўсе спрэчкі па пытаньнях збавеньня. Аднак дасягнутая дамоўленасьць здымае асноўнае пытаньне, празь якое ўсё й пачалося...

Дэклярацыю падпісалі кіраўнік Рады Сьвятога пасаду, якая займаецца пытаньнямі адзінства хрысьціянаў, кардынал Эдвард Касыдзі й прэзыдэнт Сусьветнае фэдэрацыі лютаранаў, біскуп Хрыстыян фон Краўзэ. На цырымоніі прысутнічалі больш за 600 ерархаў абедзьвюх цэркваў.

Кардынал Касыдзі, адзін з найбольш уплывовых ерархаў у Ватыкане, лічыць гэты акт узаемакаяньня й пагадненьня адным з найбольш значных у гісторыі хрысьціянства наогул. «Праз стагодзьдзі мы ўпершыню прыйшлі да супольнасьці. Падпісаньне Дэкларацыі прывяло да сканчэньня рознагалосься ў пытаньнях дачыненьня Бога з чалавецтвам і чалавецтва з Богам. Скончылася спрэчка даўжынёю ў 469 гадоў», — адцеміў кардынал.

Гэтак да мільярду хрысьціянаў-каталікоў наблізіўся лютаранскі рух, які падтрымліваюць больш за 60 мільёнаў вернікаў, найперш у Нямеччыне, Скандынавіі й ЗША. Лютаранамі таксама ёсьць большасьць нашых суседзяў-латышоў і эстонцаў. Захаваліся да сёньня дзьве лютаранскія суполкі і ў Беларусі. А ў мінулым стагодзьдзі толькі ў Менску іх было тры.

На жаль, астатнія хрысьціянскія канфэсіі напярэдадні другога тысячагодзьдзя хрысьціянства застаюцца паасобку. Можа гэткі прыклад, калі ніхто нікому не накідвае свае рацыі, здасца павучальным і для нас?

С. Х.

RADIO FREE EUROPE · RADIO LIBERTY

БЕЛАРУСКАЯ СЛУЖБА РАДЫЁ СВАБОДА

Новыя хвалі ад 31 кастрычніка 1999 году

Час	*Хвалі*
18.00-19.30 *паводле менскага часу*	6000 і 6170 кгц (49 м) 7155 кгц (41 м) 9615 кгц (31 м)
22.00-23.30 *паводле менскага часу*	6010 і 6025 кгц (49 м) 6170 і 7155 кгц (41 м)
6.00-7.00 *паводле менскага часу*	5995 кгц (49 м) 7275 і 7295 кгц (41 м) 9750 кгц (31 м)

Сталая частата на сярэдніх хвалях — 576 кгц

Адрас: 220005 Менск-5, п/с 111; Vinohradska 1, Praha 110 00 CZ
Праграму можна слухаць, чытаць, а таксама пісаць у рэдакцыю праз *Інтэрнэт*
WWW.SVABODA.ORG

НАСТРОЙЦЕСЯ НА "СВАБОДУ"!

Наша сусьветная спадчына

Пазаўчора, 6 лістапада, у віленскай Ратушы адбыўся сэмінар, прысьвечаны 5-й гадавіне ўлучэньня Старое Вільні ў Сьпіс сусьветнае спадчыны. З таго часу зьберагаць нашыя помнікі тут дапамагае ЮНЭСКА. Гэтая арганізацыя і парупілася пра ўрачысты сэмінар, на які былі запрошаныя бізнэсоўцы, рэстаўратары ды культуролягі з розных краінаў.

У апошнія гады на рэстаўрацыю ды ўпарадкаваньне Старое Вільні выдаткоўвалі пад 4 мільёны даляраў у год. Прыватныя інвэстары ўкладалі яшчэ па мільёне й болей. На наступны год плянуецца сабраць яшчэ на мільён болей. Але грошы — ня ўсё. Дырэктар Дэпартамэнту аховы культурных каштоўнасьцяў Альгімантас Дзягуціс сказаў, што першая праблема — растлумачыць інвэстарам каштоўнасьць помнікаў. «А то яны ймкнуцца адразу ж усталяваць на ўсіх першых паверхах вітрыны». Яшчэ адна праблема — новыя ўласьнікі дамоў пачалі зачыняць свае дзьверы, з-за чаго прападае колішні дух места. Наступная праблема — маёмасьць рэлігійных канфэсіяў. «Яна яшчэ далёка не інвэнтарызаваная, хоць фінансуецца за кошт бюджэту. Няма нават спарадкаванай справаздачнасьці пра дадатковыя іхныя крыніцы даходаў і разьмеркаваньне сродкаў на рамонт культурных каштоўнасьцяў».

Вось якія праблемы зь вялізным віленскім старым местам.

Адкуль браць нафту

Беларусь увесь час у пазыках за расейскую нафту. І Літва таксама. Ды вось на мінулым тыдні Літве кранік адкрылі. І не задарма. Расейскую нафту набыла амэрыканская кампанія «Ўільямс». Амэрыканцы цяпер сталі ўладальнікамі амаль усяго літоўскага нафтаперапрацоўчага комплексу. Не пасьпелі даліць шампанскае пасьля падпісаньня дамовы, як на рахункі Літвы паступіла 150 мільёнаў даляраў з Амэрыкі. Амэрыканцы плянуюць за два з паловай гады рэарганізаваць усю літоўскую нафтавую гаспадарку, што абыдзецца ім у 500 мільёнаў даляраў.

Словам, зьявіўся гаспадар — зьявіліся грошы. А зь імі і нафта, і праца. Нагадаю, што папярэдні прэм'ер Літвы Паксас сышоў на знак нязгоды з продажам дзяржаўнай нафтаперапрацоўчай прамысловасьці. А новы, дзясяты па ліку з часоў аднаўленьня незалежнасьці, прэм'ер Кубілюс, сказаў: «Выйсьця няма, нафтавая гаспадарка Літвы павінна стаць самай сучаснай і буйной ў рэгіёне, а для гэтага былі патрэбныя гэтыя вялізарныя інвэстыцыі».

Стравусіна ў талерцы

Надта ж вялікая птушка стравус. І мяса зь яго багата, і аднаго яйка стравусінага на трох чалавек хопіць пад'есьці. І пер'е надта ж прыгожае. Задумалі ў Вільні тых стравусаў гадаваць. Летась, у сакавіку 1998 году, сюды прывезьлі 50 птушак. І цяпер у аднаго гаспадара, вядомага падарожніка Арвідаса Чапаса, іх цэлая фэрма. Праўда, завёз ён іх не з Аўстраліі, а з Ірляндыі. Цяпер у віленскай рэстарацыі XVI ст. «Чорны рыцар», што на Замкавай вуліцы, можна пакаштаваць і стравусіны. У Аўстраліі яе ядуць толькі марынаванаю, а віленчукі даўмеліся і стравусіныя пячонкі ў каньяку тушыць, і стравусіну з бульбаю пекчы, і проста смажыць. Уладальнік стравусінае фэрмы кажа, што сам гатуе зь яе больш за 20 страваў. Але найлепшая стравусіна — смажаная на камені.

Мэдыкі сьцьвярджаюць, што стравусіна надзвычай карысная, бо ў ёй амаль няма тлушчаў і багата бялкоў. Найперш карысная для дзяцей і спартоўцаў.

Ліцьвін

НАМ БЫ ЗЬ МЕНСКАМ РАЗАБРАЦЦА

28 кастрычніка, на 60-я ўгодкі далучэньня Вільні да Літоўскае Рэспублікі, адбылася пазачарговая сэсія літоўскага парлямэнту. Паседжаньне адкрыў старшыня сэйму Вітаўтас Ландсбэргіс, які зазначыў, што гэтая дата надзвычай важная, бо «адбылося вяртаньне Вільні і Віленскага краю Літве. 60 гадоў таму гістарычная справядлівасьць вярнула краіне спадчыну».

З нагоды ўрачыстасьцяў старшыня ВС РБ Сямён Шарэцкі ў Камітэце правоў чалавека літоўскага Сэйму адказаў на пытаньні літоўскіх парлямэнтароў:

«Паважаныя калегі. Ніводзін дэмакрат наш сёньня, я вас у гэтым запэўніваю, не прэтэндуе ні на колькі зямлі паза нашымі межамі! Прытым гэта тычыцца ня толькі Літвы, але і Расеі, і Польшчы».

На гэта старшыня Камітэту сп.Зінгерыс удакладніў:

«Спадар Пазьняк, зь якім у нас добрыя ўзаемадачыненьні, у 92-м годзе высоўваў гэткія прэтэнзіі».

Сямён Шарэцкі:

«А я магу сказаць, што з боку пэўных літоўцаў лічыцца, што Літва цягнецца аж за Нарач. Але нельга ж выхопліваць гэткія рэчы й разьдзімаць іх. Я вам аўтарытэтна заяўляю, што ніколі гэтае пытаньне ўсур'ёз не падымалася. Запэўніваю, што ня будзе ўздымацца й надалей, што нібыта сталіца Вільня ёсьць сталіцаю Беларусі. Нам трэба думаць пра тое, каб цяперашняя сталіца Беларусі — Менск — стаў беларускім горадам».

Адносна гістарычнага статусу беларусаў у Вільні Сямён Шарэцкі сказаў літоўскім калегам наступнае:

«Мы, беларусы, удзячныя жыхарам Вільні ўсіх нацыянальнасьцяў, якія на працягу доўгіх стагодзьдзяў давалі магчымасьць прыяжджаць сюды беларусам і ствараць тут свае друкарні (я маю на ўвазе Скарыну), пачынаць тут і нашае пісьменства, і адукацыю»...

Нагадаю, што літоўскае войска ўвайшло ў Вільню 23 кастрычніка 1939 году пасьля таго, як горад, так і не атрымаўшы афіцыйнага статусу сталіцы Заходняй Беларусі, быў пакінуты Чырвонай арміяй згодна з пагадненьнем паміж фашыстоўскай Нямеччынай і сталінскім СССР, як і было абумоўлена ў пакце Молатава-Рыбэнтропа.

Андрэй Старавойтаў

Фота Анатоля Клешчука

СЬВЯТА ДРЭЙФУЕ

Было нам неяк зайздрасна і шкода,
Чаму Кастрычнік нам не аднагодак.

Можа Мікола Аўрамчык, аўтар гэтых радкоў, сапраўды шчыра шкадаваў, што яму не давялося пабачыць Вялікага Кастрычніка. Што да мяне, дык я ніколі не адчуваў нястачы вялікіх падзеяў у сваім жыцьці. Асабліва цяпер, калі рэвалюцыі — амаль на кожным кроку. Зьмена кіраўніцтва БНФ, Марш Свабоды (Рэвалюцыя 17-га), масавыя арышты — усё ў адзін месяц і ў адной, нашай, краіне.

Што да Кастрычніка, дык яго заўсёды сьвяткавалі то не тады, то ня там. Да 1930 г. у БССР, як і ўва ўсім Савецкім Саюзе, адзначалі ня факт гвалтоўнае зьмены ўлады, які не адмаўляўся, а чарговую гадавіну Рэвалюцыі — тады, калі яна й адбылася — у лютым. Што сьвяткавалі апошнія савецкія пакаленьні — застаецца пытаньнем. Што сьвяткуюць сёньняшнія беларусы, калі сёмага лістапада над Скарынаўскім праспэктам вывешваецца "расьцяжка", дзе ўсіх паздраўляюць з празьнікам — таксама.

Згадваю, як напачатку 90-х зьнянацку галава Леніна ў маёй 30-й СШ зьмянілася на бюст Скарыны. На лекцыі гісторыі настаўніца неяк згадала пра кастрычніцкую рэвалюцыю, адцеміўшы, што насамрэч гэта быў "пераварот". Ужо тады я ведаў, што жыву ў Менску — сталіцы Беларусі. Да маіх адкрыцьцяў дадалося яшчэ адно: кастрычніцкі пераварот, які мы дагэтуль сьвяткавалі ў сям'і, адбыўся, апроч усяго іншага, ня ў нас, а ў суседняй краіне. Прычым, у краіне, якая сёньня фактычна адмовіла значэньне бальшавіцкага пераварота і вярнула атрыбутыку царскіх часоў — дарэвалюцыйныя герб і сьцяг.

Такім чынам, галоўнае камуністычнае сьвята пусьцілася ў дрэйф ня толькі ў часе, але і ў прасторы.

Віктар Мухін

АКЦЯБАРСКІЯ

7 лістапада 1999-га. Беларусь восьмы год жыве без артыкула ў Канстытуцыі пра кіраўнічую ролю камуністычнай партыі. Вонкава зьмянілася мала што. Па гарадах, мястэчках і вёсках па-ранейшаму стаяць помнікі Леніну, гэтае імя па-ранейшаму носяць вуліцы і калгасы. Намэнклятура ўсіх узроўняў сьвята захоўвае стыль работы колішніх партыйных кіраўнікоў. Паспаліты народ ад усёй сусьветнай рэвалюцыі, якая мучыла яго на працягу XX стагодзьдзя, пакінуў сабе адзін каляндарны дзень, дакладней, яго назву — *Акцябарскія*. *На Акцябарскія* прыязджаюць да сваякоў, зьбіраюцца за сталом, *да Акцябарскіх* трэба нешта дарабіць, *пасьля Акцябарскіх* дамовіліся вярнуць пазыку. *Акцябарскія* — гэткі самы пункт адліку часу, як Каляды або Вялікдзень. Сумнеўна, праўда, каб сёньня за сямейным сталом *на Акцябарскія* прамаўлялі тосты, так бы мовіць, па тэме. Бо ўсё, што засталося ад тэмы ў сьвядомасьці народу — гэта сама дата, непрацоўны дзень.

Тады сама ў 1991-м, калі быў адменены партыйны артыкул Канстытуцыі, аднавіўся выхад першай беларускай газэты «Наша Ніва». Рэдакцыя сваёй задачай паставіла дэкамунізацыю культуры. Гэта значыць, адраджэньне культурных традыцыяў, не дэфармаваных, не папсаваных савецкай ідэалёгіяй, выхад з «ружовага туману» хлусьні. З тае пары прамінула восем гадоў. Самы час акінуць вокам наша інтэлектуальнае жыцьцё — ці адбываецца ў ім ачышчэньне ад колішняй дагматыкі? Якія каштоўнасьці прыйшлі на зьмену «Маральнаму кодэксу будаўніка камунізму»?

Найбольшы беспарадак — быццам тут з грунтоўным ператрусам прайшліся ўсе шматлікія спэцслужбы краіны — пануе сёньня ў беларускай літаратуры. Адбываецца пакутлівая ратацыя клясыкаў савецкага пэрыяду ў незалежніцкія, а то й постмадэрнісцкія шыхты. На руінах колішняе літарганізацыі блукае недарэчны прывід, у якога адабралі ідэалёгію, сказаўшы пры тым, што пісьменьнік у нас па-ранейшаму застаецца пасадай дзяржаўнай.

Застаецца пытаньне — ці беларуская літаратура апрытомневае пасьля камунізму, ці сапраўдны катарсыс або, калі хочаце, крызыс яшчэ не наступіў? На карысьць першага адказу сьведчыла б ажываньне крытыкі — галоўнага санітара і парадкавальніка літаратурнага працэсу. Аднак ніякага такога ажываньня не назіраецца — ніхто нават не спрабуе расставіць кнігі па паліцах. Таму застаецца другі адказ — пра пярэдадзень крызысу і яшчэ большага хаосу. Гэта калі казаць пра літаратуру ў цэлым — пра яе школы, канцэпцыі і жанры. Што да самых літаратараў, дык яны вырываюцца зь беспарадку па адным. Няпроста рабіць гэта сучаснікам, а яшчэ цяжэй клясыкам. Іх нібы зачынілі ў вялізным ангары з шыльдаю «Пераацэнка каштоўнасьцяў», і яны там марнуюцца за іржавымі жалезнымі дзьвярамі, бо цэх гэты каторы год не працуе.

Напрыклад, галоўнага беларускага эстэтыка прафэсара Крукоўскага асабіста я апошні раз чуў на зьезьдзе БНФ, дзе ён выступаў у абарону Зянона Пазьняка. Даўно не выходзілі і кнігі Ўладзімера Конана — яшчэ аднаго стаўпа беларускай эстэтыкі. Вучань Конана эстэтык і паэт Алег Бембель падаўся ў манастыр. Якой-кольвек зьмены пералічаным творцам не зьявілася. Разам зь іхным маўчаньнем сьцішылася і створаная імі сыстэма каштоўнасьцяў беларускае культуры, якую яны плённа распрацоўвалі за савецкім часам і якая найлепшым чынам сыстэматызавала нашы нацыянальныя здабыткі. Здаецца, сёньня культуры моцна бракуе гэтых *людзей у вежах*, якія зьвяраюць нацыянальны шлях па зорах, па плёнах папярэднікаў і па ўдарах сэрца. Менавіта бязь іх утвараецца хаос, зь якога ўжо не відаць ані канцэптуальнага, ані жанравага выйсьця. Пра авангард ці нейкую навіну, новае слова ўсе ўжо і думаць забылі. Тут бы выжыць, абы перажыць...

У Беларусі ёсьць таленавітыя мастакі, але мы ня можам вылучыць іх і назваць, бо гэтага не зрабілі беларускія мастацтвазнаўцы. Беларуская мова пакінутая на сямі вятрах і выбірае альбо інэрцыйны савецкі, які ні ёсьць, але парадак, або чакае свае клясычнае граматыкі ў выкананьні новых мовазнаўцаў. Мова чакае пераацэнкі. Беларуская гісторыя думае не пра тое, што ёй пісаць, але найперш — як пісаць, каб супадала з сучаснымі перакананьнямі ці з патрабаваньнямі тых, хто плоціць за гэта грошы, альбо — каб не нашкодзіць. У выніку штосьці галоўнае ўвесь час высьлізгае з тэкстаў, а паміж высновамі ніяк не ўзьнікае сувязі.

Самая паказальная сытуацыя — у беларускім тэатры. Найбольш публічнае мастацтва нязьменна зьбірае поўныя залі і нязьменна ўражвае цудоўнай ігрою артыстаў, а таксама рэжысурай і сцэнаграфіяй. І ўсё гэта адбываецца пры фактычна поўным заняпадзе нацыянальнае драматургіі. Становішча, блізкае да мэтафары. Найбліжэйшае да вулічных настрояў мастацтва сыгналізуе пра тое, што ўсё гатова да жыцьця. Але крызысуе прапанова (чытай літаратура), крызысуе прафэсійная рэфлексія (чытай крытыка). Зрэшты, і квіток у тэатар каштуе, як жэтон на мэтро. Крызысуе грамадзтва. Магчыма, гэта і ёсьць сама ва ўсёй красе задоўжаная і пакутная, такая цяжкапераадольная дэкамунізацыя — адраджэньне пасьля камунізму.

Сяргей Паўлоўскі

ГАДАВІНА

Дзіўны, пачварны анахранізм: дэманстрацыі, чырвоныя гвазьдзікі, паветраныя балёнчыкі, кіно пра рэвалюцыю ў тэлевізары... СССР, БССР...

Нясьлушна называць Беларусь "камуністычным запаведнікам" — камуністам тут гэтак сама цяжка, як іншым. Параўноўваць Лукашэнку з Гітлерам ці Піначэтам увогуле сьмешна — тыя былі злодзеямі. А гэты — недалуга. Вядзе дзяржаву ў «адзіна магчымым» кірунку, проста не ўсьведамляючы, што могуць быць іншыя. Цяперашняя РБ сьвята пільнуецца дзяржаўнай традыцыі БССР. Пільнуецца нічога і ідзе ў нікуды, бо дзяржаўнай традыцыі БССР не было, бо БССР — гэта толькі чатары літары і шэсьць абласьцей пры поўнай адсутнасьці дзяржаўнай, грамадзкай, культурнай рэальнасьці. БССР без СССР — нішто. І РБ як пераемніца БССР — нішто без надбудовы-мэтраполіі. Вось Лукашэнка і рвецца ў Расею. Ён мусіць напоўніць пустую, спарахнелую форму новым зьместам, надбудаваўшы новы саюз — а хоць бы і не савецкіх сацыялістычных — рэспублік.

Як высьветлілася, рэч гэта зусім няпростая, і ўжо зараз на яшчэ нестарым твары Лукашэнкі часам відаць шчырае, глыбокае расчараваньне і крыўду. Хацелася б убачыць гэты твар у тое імгненьне, калі носьбіт яго зразумее, конча і безнадзейна, што павярнуць гісторыю немагчыма.

А пакуль у Беларусі ёсьць такое дзіўнае сьвята — гадавіна кастрычніцкага перавароту ў Расейскай імпэрыі.

Алесь Пяткевіч

РЭВАЛЮЦЫЯ, ШМЭВАЛЮЦЫЯ...

Натальля БАБІНА

Рэвалюцыя, шмэвалюцыя... Дабрацца да канапы, выцягнуць ногі... Бо яны аж дыгаюць. Высоўваю гіпотэзу: калі б у Леніна і Крупскай былі дзеці, рэвалюцыя не адбылася б. Адзін маленькі сьпінагрызік у доме — і ўжо не наўме многае з таго, што й не павінна быць наўме. Як казаў створаны рэвалюцыйным нобэлеўскім ляўрэатам незабыўны Макар Нагульнаў: "А ў каго яшчэ дзеці пойдуць, энты для партыі ваўзят чалавек згінэлы. Ён табе ўмомант вывучыцца дзіцёнка песьціць, да паху яго малочнага паабвыкне і — гатовы, сьпёкся! Зь яго і баец нікудышні, і працаўнік чохавы". Гэта з маральнага пункту гледжаньня, а ёсьць жа і матэрыяльны. Тады ж не было ні пампэрсаў, ні пралак! І цікава (даруй, Госпадзе, думку грэшную), ці хапала б у Крупскай малака? Хаця што, яны нанялі б прыслугу і карміцельку і зноў займаліся б рэвалюцыяй! А дзеці тады памералі нашмат часьцей, чым у наш час. Шчасьлівая маці Леніна, было, здаецца, шасьцёра, усіх падняла. Умела, значыць, хадзіць каля дзяцей.

Помніцца, Долі з раману "люстра рускай рэвалюцыі" енчыла над сваім памёрлым дзіцяткам на тле "нейкай агульнай абыякавасьці да маленькай труны". Чаму, дарэчы, Талстой — "люстра рэвалюцыі"? Здаецца, тут сытуацыя, якую ў нас у Заказанцы звычайна характарызуюць словамі: "Він хочэ цуцынятко, та шчэ й рабэнькэ!" Мала таго, што я, Ленін, — правадыр рэвалюцыі, дык трэба яшчэ пастарацца ўсіх упэўніць, што гэная рэвалюцыя — асноўнае, што цікавіла знакамітага пісьменьніка.

А якія вершы, напэўна, пісаў бы, каб не рэвалюцыя, яе "асэнізатар і вадавоз"! Такі талент, мог бы стаць кімсьці накшталт расейскага Ўітмэна, але ж замест "Лісьця травы" пажадаў напісаць "Уладзімір Ільіч Ленін" — і маеш! Не прайшло і ста гадоў, і каму гэта цяпер трэба? На кніжным клюбе, што праўда, прадаецца кніга "Тайна гібелі Маякоўскага", але ніхто больш сябе пад Леніным ня чысьціць, каб плыць у рэвалюцыю далей. Падазраю, праўда, што і тады ніхто ня чысьціў, а паэт проста трапіў пад уплыў фікцыі, што і зрабіла яго творчасьць бясплённай у пэўным сэнсе.

Андрэй Дынько зь іншай нагоды некалі напісаў: "Праблема зь беларускай савецкай літаратурай заключаецца ў тым, як яе забыць". Так і тут. Лепшае, што можна зрабіць у чырвоны дзень календара — забыць тую рэвалюцыю. Фікцыя яе ня мае ніякага дачыненьня да здароўя, грошай, паўнавартаснага жыцьця. Памылкова думаць, што рэвалюцыя як такая змагла (зможа) вырашыць нейкія праблемы. Як памылкова седзячы чакаць, што вось нарэшце скінуць Лукашэнку, прыйдзе замест Шмукашэнка — і зажывем, заквітнеем. Хвігу. Седзячы, каня з возам ня выседзіш, як, зноў такі, кажуць у нас у Заказанцы. Круціцца трэба, каб аж сьвісьцела. Пра сьвіст і думаць, а не пра нейкую калатнечу, якая, тым больш, адбывалася, дай Бог памяці, аж 82 гады таму!

...А цяпер прымусіць сябе зьлезьці з канапы — спачатку ў адзін дзіцячы пакой, тады ў другі, тады на кухню, тады да кампутару. Рэвалюцыйны, словам, трымаць крок, бо няўрымсьлівы ня дрэмле вораг!

Фота IREX-ProMedia

лісты ў рэдакцыю

Хто рабіў гісторыю?

У матар'яле «Пярэдні край» у мінулым нумары «НН» былі істотныя недакладнасьці. Перадусім гэта тычыцца ступені ўдзелу розных патрыятычных арганізацыяў у падзеях Маршу Свабоды 17 кастрычніка. Слушная расстаноўка акцэнтаў у гэтай справе патрэбная для папярэджаньня чутак і легендаў.

«Малады Фронт». Тэлевізія растыражавала выяву расьцяжкі з назваю арганізацыі, а газэты завіхаліся, кажучы аб прыналежнасьці да МФ трох маладых людзей, на якіх заведзеныя справы (насамрэч два зь іх ад МФ адышлі яшчэ ў 1997-м). Але радыкальная адмова сп.Севярынца ад любога гвалту (у нашых умовах — чытай: дзеяньня) паспрыяла выхаду з МФ дужае хлапечае часткі. У выніку 17-га групаю шкаляроў з МФ кіравалі дзьве дзяўчыны (sic!). Паказальна, што таму дзясятку падлеткаў з расьцяжкаю МФ шыхты на чале калёны зьедліва кідалі: «Збочце, раздушым».

«Партыя Свабоды». С.Высоцкі зноў разводзіць рыторыку пра «нацыянал-рэвалюцыйны эфэкт» падзеяў 17-га. Праўда, сам партыйны лідэр у часе кожнае апошняе радыкальнае акцыі чамусь пэрманэнтна зьяжджае ў Варшаву (паднабрацца сьмеласьці?). Як ён кажа, «кантраляваць варшаўскі этап барацьбы з дыктатурай» (газэта «Згода»). Тады як тузін яго партыйцаў, якія ўзялі ўдзел у першай частцы Маршу, на скрыжаваньні праспэкту з Варвашэні-Казлова арганізавана селі ў трамвай і зьехалі ў адваротным ад Маршу кірунку. Потым сп.Высоцкі скажа, што «мэтай удзелу сяброў БПС у акцыі 17-га было падвесьці масу да месца магчымага сутыкненьня зь міліцыяй». Выдатна! І адпавядае абвешчанаму лідэрам БПС курсу на тое, каб «самі маскалі, убачыўшы наш супраціў, не схацелі б яднацца» (газэта «Згода»).

Наяўнасьць зялёных банданаў на тварах хлапцоў першых двох шыхтоў сьведчыць аб актыўным удзеле ў Маршы Свабоды ўжо крыху падзабытага «Белага Легіёну». Зялёны бандан меў і чалавек, які шыхтаваў і вёў арганізаваную галаву калёны.

Побач зь легіянэрамі шыхты складалі й сябры арганізацыі «Край». Праўда, была заўважаная адсутнасьць кіраўніка, які б кардынаваў удзел «краёўцаў».

І напрыканцы будзе дарэчнаю цытата з С.Высоцкага: «І нічога, што нехта набраў палітычныя балы, скарыстаўшы мужны парыў беларускае нацыі да жыцьця і ўласнае волі. Хіба гэта галоўнае? У справе нацыянальна-вызвольнага супраціву альбо ўсе перамогуць, альбо ўсе ж і прайграюць».

Сказана добра.

Драб

Палітыка — гэта наркотык

Палітыка, мітынгі, пастарункі — гэта наркотык, які траўмуе псыхіку чалавека. Каб любіць гэты сьвет такім, якім ён ёсьць, трэба аддацца Хрысту, а не выбіраць «паміж воляй і сьмерцю, паміж воляй і страхам», як піша П.Севярынец. Бо калі гэты выбар робім бяз Бога, гэта выбар паміж нічым і нічым. Нельга казаць, што я ў Цябе веру, Госпадзе, але зараз ня той час, каб слухацца Цябе. Маўляў, вось пераможам, а пасьля буду маліцца і выконваць Тваю Волю. У такім выпадку мы крочым у нікуды і нічым не адрозьніваемся ад людзей на тым баку барыкадаў.

Мы так баімся быць прыніжанымі, а Хрыстос казаў: «Каб быць першымі, станьце апошнімі». Трэба радавацца магчымасьці жыць тут, у Беларусі, магчымасьці быць прыніжанымі, як Хрыстос. Калі сапраўды зьвярнуцца да Бога, тады і Ён нешта зьменіць тут, на нашай зямлі. Ня трэба кідацца высокімі фразамі аб хрысьціянскай годнасьці, бо фарысэі, калі расьпіналі Хрыста, таксама лічылі, што іхная праўда.

Я сама калісьці марыла аб тым, як БНФ прыйдзе да ўлады, але хутка стамілася ад палітычных амбіцыяў. Паступова даравала ўсім, нават судзьдзю, які даў майму мужу паўтара году зьняволеньня. І Госпад праз маю слабасьць паказаў усю моц маёй душы. Я шчасьлівая, што жыву ў Беларусі, нават калі ёй кіруе Лукашэнка. Таму і Паўлу Севярынцу, які робіць першыя крокі ў пазнаньні Бога, я хачу параіць ня кідацца высокімі фразамі аб моцнай Веры. І пажадаць, каб калінебудзь на пытаньне «Ці дараваў я ўсім?» яго сэрца адказала: «Так».

Іна Піменава-Шыдлоўская

Ператвараюся ў анархіста

Растыражаваны вобраз анархіста — махновец з чорным сьцягам у адной руцэ і маўзэрам у другой. Маўляў, вольнаму — воля, шалёнаму — поле. Насамрэч няма на сьвеце нічога больш бруднага і страшнага за вайну, акрамя рабства. І няма для сапраўднага анархіста большае каштоўнасьці за свабоду.

За свабоду і дзеля свабоды перабілі на сьвеце безьліч людзей. Майго прадзеда ад любові да роднага краю дваццаць гадоў вызвалялі на сібірскай катарзе. Майго дзеда вызвалілі ад царызму. Бацьку — спачатку ад польскай акупацыі, потым ад бальшавіцкай, фашыстоўскай, потым ад уласнай зямлі, ад культу асобы і валюнтарызму. Мяне вызвалілі ад сацыялізму, камуняк, СССР і жудасных ныянал-дэмакратаў. Але ж сапраўднага вызваленьня няма і няма.

Няма радасьці ад дымку над крэматорыем, брыдка глядзіцца патрыятычны заклік над баракам, не дадаюць шчасьця шыхты з роднымі сьцягамі і шыхты з бляшанымі шчытамі. Найболей не хачу, каб мяне яшчэ ад нечага вызвалялі. Найменей хачу вызваляць каго-небудзь. Хачу сам. І раблюся падобным да анархіста.

Калі нешта замінае зьмяняцца да лепшага, спытайся ў свайго сумленьня, як пазбавіцца перашкоды: самому ці то разам зь некім. І адсунь перашкоду. Гэта анархія.

Калі размаўляеш, а не чакаеш Закону аб мовах, атрымліваецца анархія.

Калі ня кажаш «я бяссрэбнік», а імкнесься зарабіць болей — гэта анархія.

Калі страшна ісьці біцца, але ты не балбочаш пра «пацыфізм», а моўчкі дапамагаеш, чым здольны — дык і гэта таксама анархія.

Калі ў цябе адзіны начальнік — сумленьне, дык ці ёсьць на сьвеце большы за цябе анархіст?

Таму кажуць: «Анархія — матка ладу». Таму ейных дзетак так няшмат.

Міхал Залескі

ЯК 20 ГАДОЎ ТАМУ

Беларускія правінцыйныя «раёнкі» — зьява проста ўнікальная. Гартаючы «грамадзка-палітычныя газэты» N-скіх раёнаў, часта немагчыма зразумець, у якім часе жывеш.

Гэтак, ва ўсіх трох апошніх нумарах «Івацэвіцкага весніка» ў калёнцы «палітыка» зьмешчаныя матар'ялы пра Марш Свабоды.

Вось цытаты зь іх:

«У той час, калі ўлады рэспублікі прыкладаюць усе намаганьні, каб хутчэй убраць вырашчаны ўраджай, каб як сьлед падрыхтавацца і правесьці ацяпляльны сэзон, каб у цэлым забясьпечыць нацыянальную бясьпеку краіны і больш-менш дастойнае жыцьцё народу ў гэты складаны пераходны пэрыяд, беларуская апазыцыя, а дакладней яе экстрэмісцкія колы, спрабуюць дэстабілізаваць абстаноўку... парушыць наша мірнае жыцьцё...» (№86).

«Гэта фашысты, гэта бандыты, а не апазыцыя» — такая агульная думка абсалютнай большасьці нашых людзей, і яны заклікаюць прэзыдэнта краіны палажыць канец такім вось дзеяньням апазыцыі і яе прапагандыстам і агітатарам — так званай «незалежнай» «дэмакратычнай» прэсе, якая корміцца далярамі заходняга капіталу» (№86).

«Няўжо вы, панове «незалежнікі», ня можаце зразумець: тыя, хто хоча правіць усім сьветам, падтрымліваюць і падкормліваюць вас, апазыцыю, служкаў яе — «незалежныя СМІ», дзеля таго, каб паглыбляўся крызыс у нашай эканоміцы, каб не заключаны быў Саюз Беларусі і Расеі, каб ператварылася нашая бацькаўшчына ў калёнію... Ён хоча, каб у нас была вайна і кроў».

«Калі будзе падпісаны дагавор з РФ, Беларусь застанецца сапраўды сувэрэннай і незалежнай дзяржавай, і ніхто тады не пасьмее на яе пасягнуць...» (№88).

«Абсалютная большасьць насельніцтва нашага раёну асуджае такія вось акцыі «апазыцыі», выказваюць падтрымку палітычнаму незалежнаму курсу Прэзыдэнта нашай краіны...»

Ці яшчэ хто ў Беларусі выдумае такія дыямэнты?

Аляксей Дзікавіцкі

«КРАЙ» ЗЬБІРАЕЦЦА Ў ЛЕСЕ

Распавядаючы ў мінулым нумары «НН» пра беларускія вайскова-патрыятычныя суполкі, мы зазначылі, што нам так і не ўдалося зьвязацца з арганізацыяй «Край». На наступны дзень пасьля выхаду нумару з нашым карэспандэнтам зьвязаўся прадстаўнік «Краю» і прапанаваў адказаць на пытаньні, якія нас цікавяць.

— Як Вы ацэньваеце жорсткія паводзіны ўдзельнікаў Маршу Свабоды?

— Дзякуючы нашым беларускім палітыкам, агульнапалітычнае становішча ў Беларусі дайшло да такой рысы, калі ніякія іншыя формы барацьбы, акрамя вулічнай дэмакратыі, ня могуць эфэктыўна ўплываць на ўлады РБ. У першых шэрагах дэманстрантаў ішлі маладыя хлопцы, якія вызнаюць сябе беларускімі нацыяналістамі. Калі б не было іх, Марш проста спыніўся б каля першага шыхта міліцыянтаў. Цяпер жа і ўлады, і палітыкі пабачылі, што ў Беларусі нарастае хваля юнацкага супраціву. І камяні, што ляцелі ў амон 17 кастрычніка, — гэта толькі першы званок: калі палітыкі ўрэшце не дамовяцца паміж сабой за сталом перамоваў, дык барацьба ў Беларусі можа быць перанесеная ў іншую плоскасьць.

— Часта пытаюцца — ці тых, каго варта, пабілі камянямі дэманстранты? Маўляў, білі такі самы народ, а народ мусіць аб'яднацца і разам дамагчыся дэмакратыі.

— Так, дэманстрантам супрацьстаялі такія ж хлопцы, іхныя раўналеткі. Я думаю, што, калі б на мосьце стаяў, напрыклад, «нацыянальны сход» РБ, дык дэманстранты лупцавалі б яго з большым імпэтам. Шмат хто бачыў, як міліцыянтаў падганялі свае ж афіцэры — ударамі гумовых палак па шлемах ці ў сьпіну. Нават дайшло да таго, што амон і спэцназ пачалі шпурляць камяні ў дэманстрантаў.

Якое б стаўленьне да міліцыянтаў ні было, на вялікі жаль, яны не разумеюць відавочных рэчаў: іх увесь час прымушаюць уступаць у рукапашны бой з дэманстрантамі, выклікаючы з аднаго і з другога боку хвалю злосьці і агрэсіі. Рэч у тым, што ў рэжыму Лукашэнкі ёсьць больш эфэктыўныя сродкі для разгону падобных мерапрыемстваў, чым пускаць амон у рукапашную. У іх ёсьць вадамётныя машыны, гранаты са сьлезацечным газам. Але амаль што заўсёды нацкоўваюць гэтых хлопцаў. Бо, калі яны прыйдуць у казармы пасьля сутычкі з дэманстрантамі, у іх спрацоўвае такое пачуцьцё, як карпаратыўнае братэрства. Прынамсі, ва Ўручанскім спэцназе гэта так. Далі Васю па галаве камянюкай, значыць, пакрыўдзілі майго сябра, і наступным разам трэба гэтак жа моцна адпомсьціць дэманстрантам. Пры гэтым забываецца, што перад табой — бяззбройныя людзі, грамадзяне тваёй краіны. Людзі, якія, урэшце, выйшлі змагацца ня толькі за свой лёс, але й за лёс хлопцаў, якія стаяць у кардоне насупраць...

— Увесну шмат шуму й зайздрасьці выклікала ваша нечаканая акцыя ў Горадні. Многія нават прыпісвалі сабе ўдзел у ёй, хоць не былі там. Што ўяўляе сабою «Край»?

— Красавіцкая бойка ў Горадні цалкам ляжыць на сумленьні гарадзенскіх уладаў. Праводзячы жалобнае шэсьце, людзі зусім не разьлічвалі ўступаць у сутыкненьне зь сіламі аховы парадку. Увогуле, наша арганізацыя ня брала адказнасьці за гэтую акцыю. Тады было затрымана 14 чалавек, гэта ўсё адбывалася напярэдадні прыезду ў Горадню расейскай дэлегацыі. Супрацьстаянье магло працягвацца й далей, і арганізацыя проста рыхтавалася да наступных крокаў — вызваленьня затрыманых хлопцаў і барацьбы з анэксіяй Беларусі. «Край» спавядае ідэалёгію беларускага нацыяналізму. Мы ўзялі на сябе тры асноўныя функцыі. Выхаваўчая функцыя: у нас праводзяцца ўвесь час вышкалы й летнікі. Хлопцы працуюць у спортзалях, а таксама займаюцца прапагандай здаровага ладу жыцьця. Другая функцыя — прапаганда ідэалёгіі беларускага нацыяналізму. Трэцяя — нацыяабарончая дзейнасьць.

Фота «краю»

Краёўцы ў лесе

— Ці зьбіраецца «Край» рэгістравацца ў Мінюсьце?

— Дзесьці паўгады таму нам было адмоўлена ў гэтым. Мы падавалі заяўку на рэгістрацыю агульнабеларускай арганізацыі. Чалавек зь міністэрства, які сымпатызуе нашым поглядам, парадаў, што ніводная арганізацыя, якая ёсьць носьбітам беларускай нацыянальнай ідэі, ня будзе зарэгістраваная — такі загад палкоўніка Замяталіна. Цяпер, у сучасных умовах, было б вельмі дзіўна йсьці на рэгістрацыю, бо ў Беларусі няма легітымнай улады.

— Вы ўзьніклі «ніадкуль», не даяце інтэрвію журналістам, захоўваеце таямніцу. Чаму?

— Мы ў сваёй дзейнасьці прытрымліваемся такога прынцыпу: хай за нас гавораць нашыя справы. Для таго, каб крыху прыўзьняць завесу таемнасьці над нашай арганізацыяй, запрашаем журналіста ад «Нашай Нівы» да ўдзелу ў нашай бліжэйшай імпрэзе.

— Што гэта за імпрэза?

— Гэта будзе актыўны адпачынак пад адкрытым небам дзенебудзь у лесе...

Гутарыла Таццяна Сьнітко

старалітоўскія гісторыі

ГРОШЫ

Прыгоды «маладога пана» Крыштафа Тулоўскага Чыковіча, шляхціца Ваўкавыскага павету, які, будучы слугой у зямяніна Яхіма Грэбінскага, уцёк ад яго зь места Крэва, з дому тамашняй войтавай крэўскай у апошнія дні студзеня 1592 году і быў злоўлены гаспадаром праз тыдзень на дарозе пад местам Берасьцейскім.

(вольны пераказ)

Малюнак Сяргея Харэўскага

...на верх губы якобы з грош бело...
(З апісаньня выгляду каня, XVI ст.)

Вольга БАБКОВА

Можа і не шукаў бы Яхім Грэбінскі гэтак прытка свайго слугу, каб не вялізныя грошы і каштоўнасьці ды спраўны конь, якіх пазбавіў яго здрадлівы слуга. Толькі марна спадзяваўся гаспадар вярнуць страчанае дабро. Калі Яхім Грэбінскі *«за помочю Божою оного збега злодея своего постигнул и поймал...»*, дык высьветліў, што той слуга *«по дорозе едучы на розных местцах и господах маетность покраденую, марне тратечы, многим людем пороздовал...»*. Пратое, *«где што стратил»* і хто былі тыя людзі, *«добровольне»* паведаміў у Слонімскім замку сам *«ліхі»* ўцякач.

«...Я служил пану Яхиму... и недослуживши року змовеного, пана своего зрадившы и окравшы з места Кревского утек проч, а меновите, взялом речей его милости, тоест: готовых грошей сто шестьдесят и полторы копы грошей личбы литовское, а при тых пенезях ланцух золотый, у котором ланцуху пан Гребинский поведил быть золотых чирвоных шестьдесят шесть, сребра ламаного — пол грывны, перстенков золотых з каменьем розным — чотыри, а тые перстенки пан Гребинский шацовал золотых польских шестьдесят, коня з седлом гусарским и з радом, ручницу короткую з ольстром, лядунки и пороховницою, што собе пан Гребинский шацовал золотых польских семдесят...» А таксама ўзяў *«чугу»* брунатную, чорным аксамітам узорыстым падшытую (24 коп літоўскіх грошай), чугу сукна чырвонага, ядвабам падшытую (18 коп літоўскіх грошай), жупан брунатны і чырвоны, *«копеняк»* зялёны зь вялікімі срэбнымі *«кнафлямі»*, *«убране фалюндышовое бурнатное»*, коштам у тры талеры.

Уцякаючы на скрадзеным кані, абвешаным торбамі з нарабаванымі рэчамі, былы слуга надумаў заехаць да падданых *«погорелого»* касьцёла Сьвятога Духа *«от Ошмян в полмили»*. Заехаў, і напаткаў плябанскага ўрадніка з тамтэйшымі падданымі, якія ўцекача затрымалі і паведалі: *«Иж дей ты, пане молодый, втекаеш от пана своего, а меновите, от пана Яхима Кгребинского, о чом маем от него вжо заказ, абыхмо тебе задержали, а так, если дей хочеш, жебыхмо тебе пустили, тогда нам дай тых пенезей половицу...»*. Што Крыштаф Тулоўскі і зрабіў. *«Далем им, абы мене выпустили, грошей коп семдесят личбы и монеты великого князства литовского, межи которыми тыми пенезями и ланцух золотый. Взяли и ручницу короткую з ольстром и з лядунками и пороховницою...»*. А пасьля вызваленьня, ужо ў мястэчку, у *«Кгровшишках»*, тутэйшыя мяшчане *«отбили от коня»* і да сябе яго завялі. А тут яшчэ пан Сасноўскі, зямянін суботенскі князя Альбрэхта Радзівіла, нагнаўшы на дарозе, да дому свайго ўзяў *«и там дей в дому его сосновском згинуло в мене с торбою грошей коп двадцать золотых польских, сем томуж пану Сосновскому подаровал»*. Набыўшы новага каня, уцякач прыехаў *«до села паней Цыпрезское»*, але вестка пра ягоныя ўцёкі ізноў апярэдзіла, бо мясцовыя мужыкі абвясьцілі, што маюць загад затрымаць уцекача. Яны ж *«у селе две ночы переховывали, а за переховане у мене взяли грошей коп десет и перстенки два золотые с каменем, один с туркусом, а другий з дыяментом»*. А за гэта праводзілі ажно да Слоніму. У Слоніме ўцякач спыніўся ў *«бальвера»* Яна Случаніна, за што і падараваў яму, як знаёмаму свайму, *«ступачка шерстью полового»*. Але прыгоды на тым ня скончыліся, бо *«перестерог мене хлопец пана Василя Зенковича, маршалка Новогродского, которому дал осмь чирвоных золотых, а другий неякий Мартин Зарубанчич, мещанин слонимский, пришедшы з неякими помочниками своими до мене мовечи: иж дей ты, Крыштофе, хочеш выездчать, а я маю до себе от пана твоего Яхима Кгребинского писане, абым тебе имал яко здрайцу, а так есми хочеш выехать, абым тебе не отвел до замку, тедыми дай тых пенезей, которые у пана своего покрал...»*. І аддаў. Самому Зарубанчычу — дваццаць залатых чырвоных, а жонцы яго — адзін.

Гэтак скончылася бясслаўнае падарожжа ваўкавыскага шляхціца па прасторах роднае старонкі. Нягледзячы на вялікія адлегласьці, весткі і чуткі разносіліся па ёй з хуткасьцю птушак. Значна аблегчыўшы свае торбы, уцякач затое абагаціў памяць назвамі мясцовасьцяў і прозьвішчамі людзей, якія сустракаліся на ягоным няпростым шляху. Зрабіўшыся за адну ноч ўладальнікам вялікіх грошай, ён так жа хутка і пазбавіўся свайго багацьця, набыўшы, пэўна, за тыдзень бадзяньняў больш жыцьцёвага досьведу, чым за той жа час на службе ў свайго гаспадара ў Крэве.

Грошы, якія фігуруюць у гэтай гісторыі (**літоўскі грош** = 10 пенязям; **польскі залаты** = 30 польскім грошам; **залаты чырвоны** (дукат) = 48 літоўскім грошам; **талер** = 24—30,6 літоўскіх грошаў) мелі самае шырокае распаўсюджаньне на тэрыторыі Вялікага Княства пры канцы XVI ст. *«Пенези»* — тагачасная агульная назва грошай. *«Готовыми»* называлі рэальныя наяўныя манэты (ці яшчэ па-іншаму — *«рукаданыя»*, *«гатавизна»*). Усё дабро, якое можна было перавозіць, называлі *«рэчы рухомыя»*, то бок тыя, якія можна рушыць зь месца, што й зрабіў ліхі Чыковіч. І заплаціў свабодай. ■

Слоўнік старабеларскай мовы

рад — дэталь конскай зброі
ольстр — футарал
чуга — сукня зь пятліцамі, футрам падшытая
копеняк — плашч ад дажджу, без рукавоў
кнафли — гузікі
заказ — загад
туркус — біруза
барбер, бальвер — лекар, цырульнік

каляндар

150 гадоў таму

1849. «Груша цьвіла апошні год...» Гэта час Караткевічавых «Каласоў пад сярпом тваім». Па краіне хаваецца самотны змаганец Чорны Война — ад паўстаньня 1831-га да паўстаньня 1863-га. Народ слаба разумее расейскую мову акупантаў. Сялянка з-пад Менску няўцямна пазірае ў адказ на пытаньне іспраўніка: «Чья это лошадь?»

Дзевяць гадоў, як на тэрыторыі Віленскай, Гарадзенскай і Менскай губэрняў скасаваны Статут ВКЛ, дзесяць — як скасавалі царкоўную Ўнію.

Царскія ўлады «накрылі» Братні Саюз Літоўскай Моладзі, заснаваны Р. і А.Далеўскімі. Назва сьведчыць пратое, што мы яшчэ больш літоўцы, чым беларусы, а наша краіна — яшчэ больш Літва, чым Беларусь. Канчатковая падмена паняцьцяў напярадзе.

У гэтым годзе расейскія ўлады выступаюць у ролі «жандара Эўропы». Задушанае вугорскае паўстаньне. Праглядаецца пераемнасьць расейска-савецкай імпэрыі — наступнае вугорскае паўстаньне будзе задушанае ў 1956-м.

У Вільні выходзіць першая частка «Pamiętnika Naukowo-Literackiego», выдадзенага Рамуальдам Друцкім-Падбярэскім. Культ гуманітарных навук занепадае марудна і дасьць яшчэ некалькі магутных усплёскаў. Па-ранейшаму кіпіць праца ў асяродках гісторыкаў, фальклярыстаў, краязнаўцаў. Там нараджаецца ідэалёгія барацьбы за незалежнасьць.

У Гомелі акадэмік пекных мастацтваў А.Дзікоўскі заканчвае фармаваньне парку. Забытая навука сёньня ледзьве нагадвае пра сябе згібамі ляндшафту і разьмяшчэньнем старых дрэваў. Цікава, што за некалькі кілямэтраў ад парку, у раёне Валатава, была збудаваная царкоўка — ня столькі каб маліцца, колькі для прыгожай «карцінкі» з вакна палацу. Гадоў дзесяць таму царкоўка ляжала ў руінах, а як цяпер — ня ведаю. Можа хто пабачыць ды напіша.

Гадуюцца «дзеткі» для апошняга ў XIX ст. Паўстаньня, да якога застаецца чатырнаццаць гадоў.

Севярын Квяткоўскі

ліст у рэдакцыю

Зноў пра Ворсклу

Галоўная праблема пры вывучэньні гістарычнай падзеі — гэта выбар крыніц інфармацыі. Пры апісаньні бітвы на Ворскле шаноўны спадар Генадзь Сагановіч карыстаецца з айчынных кронік, якія супярэчаць заходнім. Праз гэта ўзьнікае шмат недарэчнасьцяў. Вар'яцкімі выглядаюць дзеяньні як Вітаўта і яго ваяроў, так і Цімур-Кутлука з Эдыгеем. Цімур-Кутлук зь вялікім войскам, значна большым за Вітаўтава, чамусьці чакае дапамогі Эдыгея зь яго невялічкім войскам. Вітаўт выглядае нерашучым базыліўцам, калі тры дні не прадпрымае нічога. Вельмі неразумна выглядаюць і ваяры Вітаўта, жадаючы неспрыяльнай для сябе бітвы. І поўным вар'ятам выглядае сам Вітаўт, калі праз тры дні на яго нападае... Эдыгей. Як бы забыўшыся пра вялізнае войска Цімур-Кутлука, Вітаўт кідае ўсё сваё войска на невялічкае войска Эдыгея і падстаўляе флянгі і тыл пад непазьбежны ўдар Цімур-Кутлука.

Але такога проста не магло быць. Калі тры дні войску супрацьстаіць магутнейшае войска, а нападзьдзяйсьняе невялічкае другое войска, дык любы разумны кіраўнік (а Вітаўт вельмі разумны) будзе чакаць нападу галоўных сіл ворага.

Калі прачытаць заходнія крыніцы, усё выходзіць інакш. Безумоўна, на Ворскле Вітаўт сустрэўся зь невялічкім войскам Эдыгея. І несумненна, гэта Эдыгей тры дні вёў перамовы, чакаючы дапамогі Цімур-Кутлука. Як бачна, Эдыгей паводзіць сябе разумна. Рацыянальна паводзяць сябе і ваяры Вітаўта, што бачаць малое войска татар, якое можна хутка зьнішчыць. Мудра паводзіць сябе і Вітаўт. Ён мог заатакаваць Эдыгея, але, ня ведаючы, дзе галоўны вораг — Цімур, не пажадаў падставіць флянгі і тыл пад магчымы ўдар. Эдыгей мог і не прыняць бою, а адысьці, тым больш, што яго войска больш рухомае за Вітаўтава. І зусім геніяльна выглядае плян бітвы, распрацаваны хітрым Эдыгеем і мудрым Цімур-Кутлукам.

Яшчэ адно меркаваньне. Эдыгей мог вагацца перад Вітаўтам: Вітаўт заўсёды перамагаў татараў, і ў татараў зьявіўся комплекс меншавартасьці перад ім. Але гэтага комплексу не было ў войска нераможнага Тамэрлана. Цімур-Кутлук, тайна падышоўшы да Ворсклы, не чакае ні гадзіны. Ён геніяльна кідае пад Вітаўта Эдыгея, а сам у самы спрыяльны момант наносіць зьнішчальны ўдар і навечна ліквідуе для Тамэрлана небясьпеку ад ВКЛ. Так я мяркую.

Валер Бадун, Менск

СТО БЕЛАРУСКІХ КНІГ XX СТАГОДЗЬДЗЯ

Сёньня ў агульным рэдакцыйным сьпісе найлепшых беларускіх кніг XX ст., куды мы зводзім усе прапановы нашых чытачоў, ужо каля 650 назваў. У канцы году мы назавем сто зь іх, якія называліся найчасьцей.

Апошнія допісы з сваімі варыянтамі чытачы даслалі лістоўна на паштовую скрынку рэдакцыі або праз e-mail на адрас: edit@kraj.org. Дзьмітры Казьбярук з ЗША не назваў ніводнага выданьня з тых, якіх няма ў нашым агульным сьпісе, але далучыў свой голас за ўжо згадваныя кнігі. А вось Сяржук Салаш з Барысава пералічыў ажно некалькі кніжак, што не называліся раней. Гэта казкі «Людзей слухай, а свой розум май», нядаўняе выданьне — «Пазацэнзурны пэрыядычны друк Беларусі 1971/90» і аўтарскія кнігі Максіма Танка «Мой каўчэг», Пімена Панчанкі «Высокі бераг», Сьвятланы Алексіевіч «Зачараваныя сьмерцю», Тацяны Процькі «Вынішчэньне сялянства» і Аляксандра Лукашука «Філістовіч. Вяртаньне нацыяналіста».

Натальля Рубец зь Менску дадала: «У краіне райскай птушкі» Янкі Маўра, «Баладу аб уральскім танку» Анатоля Вялюгіна (гэта першая згадка паэта ў нашым сьпісе) і «Чалавек з брыльянтавым сэрцам» Леаніда Дайнекі.

Спадарыня Раіса Жук-Грышкевіч з Канады прапанавала ўключыць у сьпіс кнігу Вітаўта Тумаша «Пяць стагодзьдзяў Скарыніяны XVI—XX».

Ананім зь Літвы сто разоў назваў кнігу Міхася Раманюка «Беларускае народнае адзеньне». Выданьне вартае. Але мы ня ўлічваем ананімных галасоў і за адну кнігу ўлічваем толькі адзін голас.

Акрамя названых, трэба згадаць яшчэ два выданьні, якія ў агульны сьпіс уключыў рэдактар «Ста кніг» (карыстаючыся сваім адным голасам) — гэта двухтамовік «Архівы БНР» і кніга Адама Глёбуса «Койданава». Кнігі новыя і, магчыма, не патрапяць у залатую сотню, але дзеля аб'ектыўнасьці мусяць быць у агульным пераліку.

Сёньня мы друкуем толькі вяршыню Алімпу — тыя кнігі, за якія аддадзена 10 і болей галасоў.

Зразумела, што сёньня яшчэ рана падводзіць канчатковыя вынікі нашага галасаваньня, бо працягваюць выходзіць кнігі, і мы атрымліваем лісты з новымі сьпісамі. Тым ня менш, ужо заўважная пэўная тэндэнцыя. Названыя вышэй 55 кніг належаць пяру 36-ці аўтараў (плюс 3 выданьні калектыўныя, даведачныя). Калі ж узяць агульны рэдакцыйны сьпіс, дык там гэткая статыстыка яшчэ больш паказальная: 650 назваў, без калектыўных і даведачных — 578, у якіх 290 аўтараў. Гэта значыць, што ў рэйтынгу кніг фармуецца ўнутраны рэйтынг аўтараў. Вось як ён выглядае на сёньня — сто чатырнаццаць аўтараў, чые кнігі разам набралі найболей галасоў (гл. агульны сьпіс зьнізу).

Гэты сьпіс у поўнай меры нельга разглядаць як ацэнку творчасьці аўтараў. Рэйтынг складзены выключна з гледзішча папулярнасьці кніг, на што ў XX ст. уплывала шмат розных фактараў. Многае ў нашым выніку залежала ад даступнасьці кніг — асабліва даўніх або замежных, або сёньняшніх «неафіцыйных». Хтосьці выдаў дваццаць кніг, кожная зь якіх атрымала адзін голас, а хтосьці адну кнігу, за якую прагаласавалі дваццаць чытачоў. Ёсьць тут пра што падумаць і выдаўцам, і распаўсюднікам беларускае кнігі...

Таксама важна ўлічваць, што гэты сьпіс не канчатковы. Наступныя зьмены ў рэйтынгу «100 беларускіх кніг XX ст.» будуць залежаць ад вашых допісаў. Дасылайце, калі ласка, свае прапановы.

Крыт.

1. Караткевіч Уладзімер 131
2. Быкаў Васіль 116
3. Купала Янка 79
4. Колас Якуб 72
5. Гарэцкі Максім 66
6. Ластоўскі Вацлаў 51
7. Геніюш Ларыса 41
8. Ермаловіч Мікола 41
9. Арлоў Уладзімер 40
10. Багдановіч Максім 37
11. Мележ Іван 31
12. Тарасаў Кастусь 30
13. Разанаў Алесь 28
14. Брыль Янка 27
15. Гілевіч Ніл 27
16. Маўр Янка 27
17. Адамовіч Алесь 26
18. Сагановіч Генадзь 26
19. Тарашкевіч Браніслаў 24
20. Арсеньнева Натальля 23
21. Смоліч Аркадзь 22
22. Цётка 22
23. Аляхновіч Францішак 21
24. Дайнека Леанід 21
25. Алексіевіч Сьвятлана 20
26. Віцьбіч Юрка 20
27. Ігнатоўскі Ўсевалад 20
28. Барадулін Рыгор 19
29. Туронак Юры 19
30. Чаропка Вітаўт 19
31. Гарун Алесь 16
32. Калесьнік Уладзімер 15
33. Чорны Кузьма 15
34. Ткачоў Міхась 14
35. Даўнар-Запольскі Мітрафан 13
36. Абдзіраловіч Ігнат 12
37. Акула Кастусь 12
38. Глёбус Адам 12
39. Дубоўка Ўладзімер 12
40. Кіпель Вітаўт 12
41. Калубовіч Аўген 11
42. Мальдзіс Адам 11
43. Стральцоў Міхась 11
44. Танк Максім 11
45. Шамякін Іван 11
46. Крапіва Кандрат 10
47. Станкевіч Адам 10
48. Сямашка Яўген 10
49. Грахоўскі Сяргей 9
50. Далідовіч Генрых 9
51. Жылка Ўладзімер 9
52. Лёсік Язэп 9
53. Мрый Андрэй 9
54. Сяднёў Масей 9
55. Цьвікевіч Аляксандар 9
56. Адамовіч Славамір 8
57. Адамчык Вячаслаў 8
58. Бядуля Зьмітрок 8
59. Вядзьмак Лысагорскі 8
60. Найдзюк і Касяк 8
61. Станкевіч Ян 8
62. Карскі Яўхім 7
63. Луцкевіч Антон 7
64. Лынькоў Міхась 7
65. Пазьняк Зянон 7
66. Улашчык Мікола 7
67. Буйло Канстанцыя 6
68. Карпюк Аляксей 6
69. Кісялёў Генадзь 6
70. Пташнікаў Іван 6
71. Салавей Алесь 6
72. Сачанка Барыс 6
73. Цітоў Анатоль 6
74. Шчакаціхін Мікола 6
75. Юхо Язэп 6
76. Яновіч Сакрат 6
77. Гайдук Мікола 5
78. Зарэцкі Міхась 5
79. Іпатава Вольга 5
80. Каганец Карусь 5
81. Лойка Алег 5
82. Некрашэвіч і Байкоў 5
83. Рубанаў Уладзіслаў 5
84. Сыс Анатоль 5
85. Янкоўскі Фёдар 5
86. Броўка Пятрусь 4
87. Бутрамееў Уладзімер 4
88. Дранько-Майсюк Леанід 4
89. Куляшоў Аркадзь 4
90. Купрэеў Мікола 4
91. Мінкін Алег 4
92. Панчанка Пімен 4
93. Пранчак Леанід 4
94. Сапач Тацяна 4
95. Юхнавец Янка 4
96. Александровіч Сьцяпан 3
97. Бондар Таіса 3
98. Вітан-Дубейкаўская Юліяна 3
99. Галавач Платон 3
100. Гартны Цішка 3
101. Жук Алесь 3
102. Калюга Лукаш 3
103. Каўка Аляксей 3
104. Лучына Янка 3
105. Макаёнак Андрэй 3
106. Максімюк Ян 3
107. Нікалаеў Мікола 3
108. Новік-Пяюн Сяргей 3
109. Петручук Васіль 3
110. Пушча Язэп 3
111. Рагач 3
112. Сіпакоў Янка 3
113. Сокалаў-Воюш Сяржук 3
114. Ядвігін Ш. 3

Багдановіч Максім. Вянок (34)
Быкаў Васіль. Знак бяды (31)
Караткевіч Уладзімер. Дзікае паляваньне караля Стаха (29)
Колас Якуб. Новая зямля (27)
Геніюш Ларыса. Споведзь (25)
Сагановіч Генадзь. Невядомая вайна (25)
Ермаловіч Мікола. Старажытная Беларусь (24)
Караткевіч Уладзімер. Каласы пад сярпом тваім (24)
Купала Янка. Спадчына (24)
Тарашкевіч Браніслаў. Беларуская граматыка для школаў (24)
Быкаў Васіль. Сотнікаў (23)
Караткевіч Уладзімер. Чорны замак Альшанскі (23)
Смоліч Аркадзь. Геаграфія Беларусі (22)
Ластоўскі Вацлаў. Кароткая гісторыя Беларусі (21)
Ігнатоўскі Ўсевалад. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі (20)
Колас Якуб. На ростанях (20)
Купала Янка. Жалейка (20)
Мележ Іван. Людзі на балоце (20)
Аляхновіч Францішак. У кіпцюрох ГПУ (19)
Арсеньнева Натальля. Пад сінім небам (19)
Гарэцкі Максім. Рунь (19)
Маўр Янка. Палескія рабінзоны (19)
Туронак Юры. Беларусь пад нямецкай акупацыяй (19)
Тарасаў Кастусь. Памяць пра легенды (18)
Арлоў Уладзімер. Таямніцы полацкай гісторыі (17)
Ермаловіч Мікола. Па сьлядах аднаго міту (17)
Караткевіч Уладзімер. Хрыстос прызямліўся ў Гародні (17)
Віцьбіч Юрка. Плыве з-пад сьвятое гары Нёман (16)
Энцыкляпэдыя гісторыі Беларусі I і II т. (16)
Гарэцкі Максім. Дзьве душы (15)
Караткевіч Уладзімер. Зямля пад белымі крыламі (15)
Чаропка Вітаўт. Імя ў летапісе (15)
Ластоўскі В. Падручны расейска-крыўскі (беларускі) слоўнік (14)
Адамовіч А., Брыль Я., Калесьнік Ул. Я з вогненнай вёскі (13)
Быкаў Васіль. Сьцяна (13)
Гарун Алесь. Матчын дар (13)
Гарэцкі Максім. Гісторыя беларускай літаратуры (13)
Колас Якуб. Сымон-музыка (13)
Абдзіраловіч Ігнат. Адвечным шляхам (12)
Беларусь. Энцыкляпэдычны даведнік (12)
Геніюш Ларыса. Ад родных ніў (12)
Ткачоў Міхась. Замкі Беларусі (12)
Цётка. Хрэст на свабоду (12)
Алексіевіч Сьвятлана. У вайны не жаночае аблічча (11)
Архітэктура Беларусі. Энцыкляпэдыя (11)
Быкаў Васіль. Альпійская баляда (11)
Дайнека Леанід. Сьлед ваўкалака (11)
Даўнар-Запольскі Мітрафан. Гісторыя Беларусі (11)
Кіпель Вітаўт. Беларусы ў ЗША (11)
Ластоўскі Вацлаў. Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі (11)
Разанаў Алесь. Вастрыё стралы (11)
Акула Кастусь. Змагарныя дарогі (10)
Гілевіч Ніл. Родныя дзеці (10)
Калубовіч Аўген. Крокі гісторыі (10)
Сямашка Яўген. Армія Краёва на Беларусі (10)

новыя кнігі, дасланыя ў рэдакцыю

В.Хомчанка. **Чырвоныя ягады:** Апавяданьні: Для малодшага школьнага веку/ Уклад. Н.Мінкевіч. Мастакі К.Ракіцкі, А.Званароў. — Менск: Юнацтва, 1999. — 431 с.: іл. — (Школьная бібліятэка). — Наклад 27000 ас. ISBN 985-05-0264-9

Эканамічная гісторыя Беларусі: Навучальны дапаможнік: 3-е выд., дапоўненае і перапрацаванае/ В.Галубовіч, Р.Ермашкевіч, Г.Бушчык ды інш.; Пад. рэд. праф. В.Галубовіча. — Менск: ВП «Экапэрспэктыва», 1999. — 454 с. — Наклад 4000 ас. ISBN 985-6102-47-2

Гэтая кніга ў сваім трэцім выданьні выходзіць, у адрозьненьне ад папярэдніх, у цьвёрдай вокладцы. У разьдзеле пра пэрыяд «рынкавага сацыялізму» канстатуецца «істотны ўзрост» усіх галін прамысловасьці.

Энцыкляпэдыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 5. М — Пуд/ Беларуская энцыкляпэдыя; Рэдакцыйная калегія: Г.Пашкоў (гал. рэд.) ды іншыя; Мастак Э.Жакевіч. — Менск: Беларуская энцыкляпэдыя, 1999. — 592 с.: іл. — Наклад 10000 ас. ISBN 985-11-0141-9

Гэты том меўся быць выдадзены яшчэ ў траўні. У выдавецтве паабяцалі, што налета ўвесь праект будзе скончаны. Дробныя непрыемнасьці: «герб «Пагоня» імкнуліся адрадзіць на тэрыторыі, акупаванай немцамі, беларускія калябаранты» ці «Наша слова»... выдаецца ад лістападу ў Лідзе... як штотыднёвая газэта для дзяцей старэйшага веку» кампэнсуюцца паведамленьнямі аб тым, што «дырэктар Нацыянальнага навукова-асьветнага цэнтру імя Ф.Скарыны — Адам Мальдзіс», а газэта «Навіны» яшчэ быццам выходзіць... Чытачы энцыкляпэдыі даведаюцца, што паводле папярэдніх зьвестак апошняга попісу насельніцтва нас стала на 114 тысячаў меней, а 4% вяскоўцаў перавандравалі ў горад. Усё гэта на добрай паперы зь вялікай колькасьцю ілюстрацыяў, каштуе 1070 тыс. у выдавецтве, у кнігарнях на 300 тыс. даражэй.

Представительная демократия в Беларуси. Международные парламентские организации/ В.Тележников, А.Тихомиров, И.Шаврук, Т.Евменова. — Менск: КЦ «РАЙ», 1998. — 176 с. — (Сэрыя: Інстытуты дзяржаўнага кіраваньня і міжнароднае супрацоўніцтва). — Наклад 10000 ас. ISBN 985-6549-01-9

У кнізе разглядаюцца органы заканадаўчае ўлады, што дзейнічалі ў Беларусі ці дзеяць дагэтуль — ад гарадзкіх вечаў да нацыянальных сходаў. Асабліва шмат інфармацыі пра апошнія.

Чытаў кнігі Віктар Мухін

некамэрцыйны праект ЗАТ "Сотвар"

Кніжкі, касэты — поштай

Беларускі гістарычны агляд. Том 5. Сшытак 2(9) — 550 тыс.р.

Іван Бурсаў. Тры вязкі па тры казкі (казкі для дзяцей) — 187 тыс.р.

Вячка Целеш. Гарады Беларусі на старых паштоўках — 1100 тыс.р.

Францішак Кушаль. Спробы стварэньня беларускага войска — 620 тыс.р.

Кастусь Каліноўскі. (З сэрыі "Беларускі кнігазбор") — 650 тыс.р.

Веткаўскі музэй народнай творчасьці, альбом — 860 тыс.р.

Мікола Ермаловіч. Старажытная Беларусь. Віленскі пэрыяд — 200 тыс.р.

і яшчэ 48 кніжак, а таксама відэакасэты з мультфільмамі для дзяцей і аўдыёкасэты для маленькіх можна атрымаць, пералічыўшы грошы звычайным паштовым пераказам на рахунак ЗАТ «Сотвар» №3012000000195 у філіі 506 ААБ "Беларусбанк", код 809. У графе "Для пісьмовага паведамленьня" напішыце, якую касэту або кніжку Вы замаўляеце.

Пры пералічэньні грошай просьба не даплочваць 20 тыс.р. да агульнага кошту замоўленых тавараў (іх Вы заплоціце пры атрыманьні кніжак на пошце).

Наш адрас: 220005, г. Менск-5, а/с 13, тэл.: 228-45-88, факс 228-45-87. Можна замовіць поўны каталёг прапановаў.



«Уліс» у самвыдаце

«Уліс», 2 CD, 1999, З.Герасімовіч пры дапамозе БМА

Добра памятаю шок, які апанаваў фанаў пасьля распаду гурта «Бонда». «Бонда» ў выніку распаду ператварылася ў непарушную легенду, а былыя «банадары» Вячаслаў Корань і Сяржук Краўчанка разам з тэкставіком Ф.Аксёнцавым узяліся ствараць «Уліс». «Уліс», гурт, радкам з гітоў якога («Радыё Свабода», «Амэрыка», «Як на далоні») наканавана было стаць слоганамі беларускага руху за незалежнасьць:

Радыё Свабода —
Мы твае хвалі і подых.
Не пакіне нас надзея:
Там, дзе няма цемнаты,
Ведаюць нас...

Адным з важкіх дасягненьняў улісаўцаў канца 80-х стала выданьне на вініле дэбютнага альбому «Чужаніца» і наступнага — «Краіна доўгай белай хмары», адціснутага ўжо ў Польшчы. Пасьля былі «Танцы на даху» і дрэйф гучаньня ў бок гранжу.

Важкім даробкам апошніх падарожжаў «Улісу» (цяпер ён складаецца з В.Кораня, бубнача А.Быкава ды басіста В.Самарукава) стала выданьне падвойнага CD гурта з 30 трэкамі лепшых, на думку складальніка, кампазыцыяў гурта з альбомаў «Чужаніца», «Краіна доўгай белай хмары», «Танцы на даху» і «Ратуйце вашыя душы». Асобным бонустрэкам на CD ёсьць вядомая слухачам, але не фіксаваная раней кампазыцыя «Цягнік на Нясьвіж».

Новы CD зьявіўся высілкамі напаўпадпольнага, аднаасабовага лэйбла Зьмітра Герасімовіча з дапамогай БМА-груп. Выданьне гэтае ілюструе рэальнае становішча беларускага рок-руху і наяўнасьць у Беларусі ўнікальнае зьявы — CD-самвыдатаў.

Пра такое, дарэчы, нельга было і марыць нейкія 10—15 гадоў таму. Тады, каб займець у сваім творчым багажы вінілавую кружэлку, трэ было прайсьці шмат выпрабаваньняў і пакут і ў родным Мінкульце, і на замежнай фірме «Мэлёдыя». Цяпер жа — воля, абы былі грошы.

Анатоль Мялыгуй

беларускі гіт-парад

(верасень—кастрычнік)

1 NRM	*Пашпарт грамадзяніна НРМ*	Каўчэг
2 Нейро Дюбель	*ЖСУНБ*	Пан-рэкардз
3 Мясцовы Час	*Халі-Галі*	БМА
4 Камэлот	*У краіне талераў*	Тон рэкардз
5 Крама	*Хворы на рок-н-рол*	Каўчэг
6 Крыві	*Гэй-лолі*	Каўчэг
7 Вольныя танцы	*Слухай Сваё! (зборка беларускіх гуртоў)*	БМА
8 Палац	*Дарожка*	Пан-рэкардз
9 Новае Неба	*Выбранае*	Пан-рэкардз
10 В.Шалкевіч	*Смутны беларускі блюз*	Тон рэкардз

Набыць ці замовіць беларускую аўдыё-, відэа- і кніжную прадукцыю можна ў наступных месцах:

Менск — кіёск «Карона» (каля крамы «Музыка»); Варвашэні 8; Галерэя «Мастацтва» (пл.Якуба Коласа); т.: (017) 2490888; **Маладзечна** — кіёск ТБМ (чыгуначны вакзал), т.: 53769 Алесь; **Гомель** — крама «Audiobox» (Першамайская 23); унівэрмаг «Гомель»; **Віцебск** —кіёскі фірмы «Саюз»; **Сьветлагорск** — кіёск 93 (раён рэстарана «Пралеска»); т.: (02342) 27815 Сяржук; **Ворша** — крама «Пілёт» (Леніна 16, т.: 44893); **Магілёў** — студыя «Ліга», Першамайская 18 (Дунька); т.: (0222) 255785; **Горадня** — штопанядзелак і сэраду па адрасе: К.Маркса 11; т.: (0152) 721183; **Баранавічы** — т.: (0163) 412430, 411046 (Алесь, Валадзей); **Бабруйск** — т.: (225) 555658 (Валеры); **Мар'іна Горка** — т.: (213) 45962; **Берасьце** — т.: (0162) 202087, 264831, 227811; **Беласток** (Польшча) — т.: 085-6616400 (Вячаслаў); праз сыстэму «Касэты — поштай». Зацікаўленыя ў супрацоўніцтве і распаўсюджваньні, зьвяртайцеся: а/с 5, **Менск**, 220085 тэл. 8-(017) 2490888 Віталь E-mail: aja@cscsc.lingvo.minsk.by

У рамках сьвяткаваньня Дня Незалежнасьці Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Польшчы ў Рэспубліцы Беларусі пан Мар'юш Машкевіч запрашае

на праграму Польскага тыдня:

8.11.1999
Дэманстрацыя в/фільму «Кароткі фільм аб каханьні», рэжысэр К.Кесьлёўскі. Беларускі дзяржаўны ўнівэрсытэт, філялягічны факультэт, вул.К.Маркса 31, а 19-й

9.11.1999
Выстава поўнага збору нотаў і запісаў твораў Станіслава Манюшкі, а таксама перадача дару «Фонду даламогі палякам на Ўсходзе» Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Вул.Чырвонаармейская 9, а 12-й

11.11.1999
Урачыстасьць з нагоды Дня Незалежнасьці і сьвяточны канцэрт. Дом Вэтэранаў, вул. Янкі Купалы 21, а 17-й

11.11.1999
Выступленьне Пасла Рэспублікі Польшча ў Рэспубліцы Беларусі пана Мар'юша Машкевіча на БТ у праграме «Панарама», а 12-й

13.11.1999
Прэзэнтацыя выдавецтва «Карта» і выставы «Перамены ў Цэнтральна-Ўсходняй Эўропе». МАЦ, пр.Газэты «Праўда» 11, а 17-й

15.11.1999
Выступленьне пана А.Кшэміньскага на тэму польска-нямецкіх стасункаў у кантэксьце эўрапейскай бясьпекі

Інфармацыя аб праграме Польскага тыдня:
Пасольства РП у Менску, тэл.: 213 43 13 Польскі Інстытут, тэл.: 220 48 74

ПРА ВАЙНУ

афарызмы з кнігі «Кантамінацыі»

Адам ГЛЁБУС

Малюнак Уладзімера Адамчыка

***

Банкіры гавораць, што вайну пачынаюць вайскоўцы — дзеля славы; вайскоўцы сьцьвярджваюць, што бойню правакуюць палітыкі — дзеля дзяржаўных інтарэсаў; а палітыкі прыпісваюць разьвязваньне баявых дзеяньняў банкірам — дзеля грошаў. Усе яны вінаватыя ў аднолькавай ступені, усе лёгка захворваюць на вірус вайны, які неабходна клясыфікаваць як масавае вар'яцтва.

***

На вайне баязьлівец хаваецца за безразважныя ўчынкі, пакуль не атрымае ўзнагароду за адвагу.

***

Вайна для Альбэра Камю зьяўлялася канчатковаю адзінотаю. Для мяне вайна проста канчатковасьць, з адзінотаю ці без адзіноты — неістотна.

***

Тыя, хто прайшоў вайну, вельмі шчыра радуюцца яе заканчэньню, але ў творчасьці не могуць выйсьці з ваеннае тэматыкі.

***

Вайна вяртае чалавека ў царства зьвера.

***

На вайне салдаты думаюць пра мір, у турме вязьні мараць пра свабоду, зімою дзеці чакаюць лета... Табе ж варта навучыцца летам атрымліваць асалоду ад лета, як мастак атрымлівае асалоду ў жніўні, калі малюе жнівенае поле пад сінім небам, а ня рабіцца вайскоўцам, што ў мірны час марыць пра баі, перамогі і ўзнагароды.

***

Калі тыран усхваляе войска, ён забываецца на тое, што войска нараджае няшчасьці й войны. Чым лепей войска, тым большая вайна чакае наперадзе ягоную дзяржаву.

***

Напярэдадні вайны аратары згадваюць антычны афарызм... Калі двое б'юцца, трэці радуецца. Згадваюць з таемным спадзяваньнем апынуцца ў ролі трэцяга. Дзьве апошнія сусьветныя вайны іх яшчэ не пераканалі, што трэцяга цяпер не бывае.

***

Старажытны рымлянін Марк Фібій меркаваў, што зьніштожыўшы грошы, тым самым можна зьнішчыць і вайну. Думаю, ён памыляўся. Грошы й зброя — сродкі вайны, а не яе прычыны.

***

Раней ці пазьней цябе абавязкова запросяць паваяваць. Адмоўся. Нават калі запрашэньне на вайну атрымаеш ад усьмешлівага, добразычлівага, адукаванага чалавека.

***

У кожным журналісьце жыве палітык, а ў кожнага палітыка ёсьць жаданьне справакаваць баявыя дзеяньні й вайну. Адпаведна, заняткі журналістыкаю й палітыкаю зрабіліся для мяне чужымі.

***

Велічных помнікаў, пастаўленых таленту, розуму, міру, зусім мізэрная колькасьць, а вось помнікаў вайне, тыранам-заваёўнікам і сьмерці ўзьведзена безьліч. Вось табе яшчэ адна несправядлівасьць на сьвеце. ■

слоўнік паняцьцяў

13. ПРА НЕМАГЧЫМАСЬЦЬ БЕЛАРУСКАГА НАЦЫЯНАЛІЗМУ.

Валерка БУЛГАКАЎ

Іван Шамякін неяк аднаго разу прынагодна сказаў, што беларускі нацыяналізм — рэч зусім немагчымая, дзікая і праціўная ягонаму ўяўленьню. Няясна, з чаго канкрэтна пры гэтым сыходзіў Шамякін, але нельга адмовіць яму ў страшнай празарлівасьці.

Што толькі ні ўважалі за «беларускі нацыяналізм» дагэтуль! І якім жаданым для юрлівых імпэрскіх ідэолягаў было гэтае паймо! У самыя жудасныя часы дастаткова было недарэчы сказаць па-беларуску некалькі словаў або мець у доме якуюсь «няправільную» кніжку, каб быць абвінавачаным у «беларускім нацыяналізме», кінутым да вязьніцы і расстраляным. Цяпер жа за кніжкі нібыта не страляюць, але дастаткова быць усяго толькі носьбітам мовы, слухаць беларускую музыку, хадзіць у беларускую царкву etc, як за табой прычэпіцца гнюснаватая-такі мянушка «нацыяналіста». Так наша расейскамоўная балышыня ў гарадах ратуецца ад беларусізацыі, а сельскае насельніцтва ўвогуле ад якой-небудзь мазгавой актыўнасьці.

На тэрміналягічна афармленай мове гэтыя канстатацыі загучаць так: пад «беларускім нацыяналізмам» да нядаўняга часу разумеліся: 1) усьвядомленыя праявы этнічнай адметнасьці, 2) радыкальныя этнічныя маніфэстацыі; зь нядаўняга ж часу пад «беларускім нацыяналізмам» пачалі разумець і «нацыяўтваральны праект», дакладней, спробы зрэалізаваць «нацыяўтваральны праект».

Аднак думаць так — азначае рабіць грубую лягічную памылку, «праектаваць будучыню на цяперашчыну». Прычым некаторыя робяць гэта незнарок, але балышыня вызнаўцаў такой візіі «беларускага нацыяналізму» культывуюць яе сьвядома, як сродак захаваньня свайго дамінуючага статусу. Нацыяналізм у строгім сэнсе ня можа разглядацца як буджэньне, часта правакацыйнае і нават камічнае, нацыянальнай сьвядомасьці; нацыяналізм ня можа таксама разглядацца як стварэньне нацыянальнай ідэнтычнасьці. Нацыяналізм — гэта спараджэньне ўжо сфармаванай нацыянальнай ідэнтычнасьці, якая падтрымліваецца інстытуцыйна, а не фармальна. Іншымі словамі, нацыяналізм адпавядае ня фазе *разгарненьня* нацыянальнай ідэнтычнасьці, а фазе яе *дагарненьня*, калі яна ўжо канчаткова ўстанавілася і здольная агрэсіўна ўплываць на хаду падзеяў.

Распаўсюджанае ў нас паймо «беларускага нацыяналізму» — гэта страшна вульгарызаванае паймо, пакліканае трымаць беларусаў у стане культурнай і моўнай меншыні.

Значыць, беларускі нацыяналізм наагул немагчымы? Зусім не. Ён ператворыцца зь фікцыі ў факт неўзабаве пасьля таго, як на зьмену Беларусі як нэакаляніяльнай дзяржаве прыйдзе Беларусь як дзяржава нацыянальная. ■

Лявон Тарасэвіч. Бяз назвы

І ВЫРАСЬЦЕ ЛЕС...

Віктар ШНІП

10. Крыжы

Сярод лесу крыжоў на могілках вырас лес. Высокі, густы, месцамі амаль непраходны. І мы ходзім у ім, як прывіды, шукаючы свае магілы. Тут, у Дубравах, што ў Маладэчанскім раёне, пахаваныя амаль усе мае дзяды і прадзеды. І сярод гэтага лесу крыжоў, які з кожным годам усё разрастаецца і разрастаецца, я бачу крыжы сваіх аднагодкаў і маладзейшых землякоў. І гэты лес для мяне самы сумны ў сьвеце і самы сьвяты. У кронах дрэваў вялікія, як барлогі, вароніны гнёзды. Вароны чорныя, як галавешкі на пажарышчах, і крыклівыя, як людзі, якія заблудзіліся ў лесе. І мы ходзім па гэтым лесе, і знаходзім свае магілы, і губляемся сярод крыжоў.

9. Дзявочая Гара

У мэтрах пяцістах ад могілак — этнаграфічна-археалягічны помнік «Дзявочая Гара». Зьвесткі пра яе ўпершыню былі зьмешчаныя ў «Геаграфічным слоўніку Каралеўства Польскага і іншых славянскіх краінаў» у 1881 годзе, дзе прыводзіцца паданьне, паводле якога даўным-даўно ў Дубравах жыла вельмі прыгожая дзяўчына. У яе закахаліся два хлопцы, і каб высьвятліць, каму зь іх быць яе мужам, яна прыдумала для іх выпрабаваньне. Зайшла на самую высокую гару ў мясцовасьці і там села на камень, да якога кожны з хлопцаў павінен быў дакаціць па камені. Хто першым справіцца з выпрабаваньнем, за таго дзяўчына і выйдзе замуж. Каменьні былі вялікія і цяжкія, і ў жаніхоў ад натугі разарваліся сэрцы. Даведаліся пра гэта людзі, схапілі дзяўчыну і жывой закапалі на гары, а побач пахавалі і хлопцаў. На іх магілы людзі паклалі каменьне. Паданьне пра Дзявочую Гару я ўпершыню пачуў яшчэ хлапчуком ад свайго дзеда, а невялічкую нататку пра ўсё гэта прачытаў у 1993 годзе ў энцыкляпэдыі «Археалёгія і нумізматыка Беларусі», дзе сярод іншага напісана: Дзявочая Гара — адзін з самых высокіх пунктаў у гэтай мясцовасьці — знаходзіцца паблізу водападзелу Зах. Бярэзіны і Сьвіслачы, амаль уся зарасла лесам. У найбольш высокай паўночна-ўсходняй частцы разьмешчана больш за 20 курганоў (вышынёй 0,5 —1,5 м, дыямэтрам 6—12 м) і вялікая яма (магчыма, засталася ад каменя, згаданага ў паданьні)... Сярод знаходак срэбнае скроневае кольца, канцы якога заходзяць адзін за адзін, абломкі ганчарнага посуду, пярсьцёнак і шкляныя пазалочаныя пацеркі 2-й паловы XI стагодзьдзя». Прачытаўшы такое пра Дзявочую Гару, я сабраў са сваіх знаёмых невялічкую «экспэдыцыю», але не для таго, каб выкапаць скарбы, а проста ўзысьці на гару. І мы паехалі. Пабыўшы спачатку ў лесе крыжоў, мы пайшлі да Дзявочай Гары. А гара, аброслая лесам, была падобная на адно велізарнае дрэва, у кроне якога хавалася XI стагодзьдзе. Да вяршыні дабіраліся амаль паўзком, чапляючыся за гольле дубкоў і арэшніку. Незвычайна высокі папаратнікавы лес, у якім павінны вадзіцца дыназаўры. Але мы сустракалі толькі сьлімакоў велічынёю з кулак. На гары ўбачылі сьвежавыкапаную яму і невялічкую кучу чалавечых касьцей. На Дзявочай Гары быў дыназаўр...

8. Лясьнік

Лясьнік у вёсцы — чалавек вядомы і патрэбны. Шкада, што ён любіць выпіць, а часам і можа добра напіцца. Аднак лясьнік застаецца лесьніком, і ён здольны прапіць што хочаш, але лес ён ніколі не прап'е. Лес для яго — родная хата. Адзін з маіх продкаў, прапрадзед Кандрат, які пражыў 96 гадоў, быў лесьніком. Ня ведаю, які зь яго быў піток, але ўжо больш за стагодзьдзе за намі, Шніпамі, трымаецца мянушка, якая засталася ад лесьніка Кандрата — Кандрацюкі.

7. Пні

Рэшткі велізарных дубовых пнёў, што яшчэ й сёньня можна знайсьці ў навакольлі маёй вёскі, — гэта рэшткі тых дрэваў, якія даглядаў лясьнік Кандрат. Будучы школьнікам і пасучы кароў, я падпальваў на лузе пні і грэўся. Згаралі пні, але глыбока ў зямлі заставаліся карані. Заставалася памяць пра лес і пра нас...

6. Сасна і бяроза

На захад ідуць цягнікі —
Лён,
Жыта,
Сасна і бяроза...
Гляджу і гляджу з-пад рукі,
Як моладасьць нашу вывозяць.

Так у 1938 годзе пісаў Максім Танк. З таго часу цягнікі зь Беларусі ідуць ня толькі на захад, а ва ўсе канцы сьвету. Праўда, цяпер лён і жыта нам даводзіцца часьцей за ўсё купляць, а не прадаваць. А вось сасну і бярозу, як і тады, ад нас вязуць і вязуць. І мала хто глядзіць з-пад рукі і бачыць, «як моладасьць нашу вывозяць»...

5. Папера

Папера стрывае ўсё... Трывае ўсё і лес. І валяецца ў лесе папера...

4. Воўк

Як ваўка ні кармі, а ён усё роўна ў лес глядзіць. І жыву я ў горадзе, і пад вокнамі ў мяне растуць бярозы, і здавалася б, што дастаткова прыроды. Ды не, лес не заменяць ніякія гарадзкія ні сквэры, ні паркі.

У лесе ў Курапатах энкавэдысты расстрэльвалі людзей. У лесе людзі хаваліся ад ворагаў, партызанілі. І гляджу я цяпер на лес, як воўк, і баюся, што сёньня ў ім не схаваесься...

3.

Лес — гэта тое, што засталося ад Адама і Эвы.

Лес — гэта Храм, у якім ня кожны моліцца.

Лес — гэта востраў у моры цывілізацыі, на беразе якога сядзіць Лесавік і якога мы ня бачым.

Лес — гэта зялёны выбух, і нікому ад яго не схавацца.

Лес — гэта спакуса пайсьці і не вярнуцца.

Лес — гэта мы.

2. Мы

На рыпучым возе еду з бацькам лесам. Пытаюся, як што называецца. Бацька расказвае. Зрэдку спыняемся, каб падабраць сушняк. Едзем доўга, і мне карціць зьлезьці з возу і ўзяць проста насячы дроваў, але я ведаю, што бацька будзе супраць. Лес для яго — жывая істота, зь якой ён можа пагаварыць. Гаварыў і я зь ялінкай, якую аднойчы знайшоў у кустоўі, што расло за хлявамі. Ялінка была адзінокая, як і я. І я прыбягаў амаль кожны дзень да яе. Расказваў ёй, як сястры, пра тое, дзе быў, што бачыў, што чуў. Чытаў ёй свае вершы. І ніхто пра наша сяброўства ня ведаў...

Са сваім малым сынам іду па лесе. І баюся, што ён запытаецца, як завецца тая птушка, што гэтак сумна сьпявае...

1. ...

Мы садзім лес. І вырасьце — лес... ■

ЛЕС ЯК...

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ

У лесе небясьпека адна — што ён акажацца недастаткова *лесам*. Што побач — людзі й вынікі іх жыцьцядзейнасьці. У лесе страшна — сустракацца зь людзьмі. Далёкі трэск гальля пад чужымі нагамі інстынктыўна прымушае шукаць зброю — няхай чыста ўмоўную. Намацаць у кішэні кітайскі сьцізорык, тупы да абсурднага, або проста сьціснуць кулакі... Ціха, яшчэ цішэй... Ён — *нехта* — сышоў. Воля непарушаная.

Бо лес — гэта воля. Успомніце, як зусім маленькія дзеці малююць лес. Яны малююць шэраг асобных дрэваў — у кожнага галінкі, на галінках — голкі альбо лісты. Пасьля, старэйшымі, усьведамляюць, што дастаткова намаляваць на гарызонце зялёную паласу.

Мы атручваем лес сабою. Як плесьня, якая расьце на хлебе. Харчуецца ім, расьце й зьмяншае яго, выклікае мутацыі, ператварае ў карузьліка, пачвару, генэтычнага калеку.

На сьцяне кватэры, дзе я нарадзілася, вісеў — і дасюль вісіць — дыван-рэпрадукцыя шышкінскай «Раніцы ў сасновым бары», памятаеце, зь мядзьведзямі. Дыван мая маці прывезла на пачатку шасьцідзясятых з Усходняй Нямеччыны. Такім чынам, шышкінскія мядзьведзі прарабілі досыць складаны фізычна шлях да нашай «хрушчоўкі». Таму сапраўдны лес для мяне назаўсёды — з паваленымі дрэвамі, сівымі бародамі моху, з высокімі соснамі й сонцам між імі. Мядзьведзі былі лішнімі. У аднаго зь медзьведзянятаў, таго, што стаіць справа профілем да гледача, у дывановай інтэрпрэтацыі было надзвычай злое жоўтае вока, якое я пэрыядычна спрабавала выкалупаць. Але ад гэтага яно рабілася яшчэ больш злавесным.

Нарэшце я замазала яго атрамантам.

Нашмат больш складаныя асацыяцыі выклікае лес Білібіна, расейскага ілюстратара казак. Да карункавасьці, у нейкай агоніі пераплеценыя галіны, травы, карэньні, імхі, павучыньне, расьліннае пераходзіць у жывёльнае, кветка — у костку, кара — у скуру. Білібінскі лес здаецца мне вельмі роднасным з русалкава-лесуновым лесам нашага мастака Славука. Роднасным, але розным.

Паводле матываў білібінскіх лясных пэйзажаў рабіў карціну супрацоўнік суседняга бюро былога майго аддзелу ВА «Гарызонт», пэнсіянэр-архітэктар, вэтэран вайны і бацька сыноў — малодшых школьнікаў ад другога шлюбу. Карціна прызначалася ў дарунак падшэфнаму цэху. Аўтар задумаў яе зрабіць з каляровага шкла. Балазе, яго на заводзе мелася ў запас — незадоўга да гэтага славутая Нінэль Шчасная закончыла майстраваць у адміністрацыйным корпусе заводу вялізны — на тры паверхі лесьвічнай пляцоўкі — цудоўны шкляны вітраж, і ўсе дачынныя да аздабленьня працоўнага побыту завадчане разжыліся рэшткамі мастакоўскага натхненьня — нявыкарыстанымі ці забракаванымі дэталямі: пералівістыя шкляныя кветкі бралі дадому як дэкаратыўныя вазы, разнастайныя круглячкі прыстасоўвалі пад попелкі. У мяне дасюль на падваконьні ляжыць шкляны жаночы твар колеру густой гарбаты, цяжкі як халера. Дык вось, шаноўны архітэктар-вэтэран прыдумаў таўчы гэтыя вітражныя парэшткі, наклейваць на кафляныя пліткі і тады абпальваць. Месяц пайшоў на ўсталяваньне патрэбнай печкі, таўчэньне шкла, абпальваньне ўзораў да атрыманьня належных адценьняў. Пасьля пунктуальная разьметка плітак паводле куточку ілюстрацыі да расейскіх былінаў, і гэтак далей. Начальства прыходзіла ў цэх экспэртаваць працу работніка, які мусіў бы за гэты час выдаць належную норму рысункаў і агітацыйных плякатаў. Начальства няшчыра ўсьміхалася, паціскала плячыма, асьцярожліва мацала абпаленыя пліткі з узорамі шкляной фарбы... Выходзіла за дзьверы. І ў калідоры пачынала ціха лаяцца.

Але задума была ўвасобленая. Карціна памерам з палову стандартнага пісьмовага стала пералівалася, як магла, ляснымі білібінскімі карункамі. А цэх быў вялікі. Звычайны. Фарбаваны балотна-шэрымі алейнымі фарбамі, з бэтоннай падлогай і плямамі мазуты на станках, з высокай стольлю, што гублялася ў прыцемках часу. Бабы ў спэцоўках і замэцганых бруднымі рукамі хустках, прымружыўшыся, разглядалі шчодры дарунак шэфаў.

У хуткім часе вэтэрана-энтузіяста скарацілі з аддзелу. Ён перайшоў у іншы і перастаў з намі вітацца. Лічыў, што маглі б мы, калегі па эстэцтве, заступіцца за яго-ную творчую асобу. Але законы ў нас лясныя. Кожны сам за сябе.

Дрэва — Жыцьця. А Лес — дарога ў іншасьвет, сьмерць. Памятаеце першую тэрцыну «Боскай камэдыі», пра зямное жыцьцё, што пройдзенае да сярэдзіны, і заблуканьне ў змрочным гушчары? А далей — чысьцец, пекла...

Хто мы больш — балотныя людзі альбо лясныя? ■

ДЗЁНЬНІК ІВАНА ІВАНОВА, МАСКАВІЦІНА

АНАНІМ

23 СЬНЕЖНЯ 2190 ГОДУ.

Сёньня мой Дзень нараджэньня. Мне споўнілася 14 гадоў. Бабуля, па старым звычаі, сьпякла вялікі пірог. Уся наша радзіна сабралася за сьвяточным сталом. Прыйшоў і мой стрыечны дзед Ерафей. Ён вельмі цікавы чалавек, гэты дзед. Папершае, ён супрацоўнік нейкага этнаграфічнага музэю, па-другое, яму ўсяго толькі сорак гадоў, па-трэцяе, ён раз-пораз размаўляе на гэтай расейскай мове, якой зараз ніхто не карыстаецца, бо ёсьць усім зразумелая і больш сучасная беларуская, а па-чацьвертае, ён заве наш горад не Масква, як усе людзі, а Москва, і кажа, што гэта яго старажытная назва. Мая цётка назвала дзеда Ерафея нацыяналістам, але я не разумею, што гэта азначае.

11 ЛЮТАГА 2191 ГОДУ.

Сёньня ў школе быў скарочаны дзень — толькі адзін урок. Мне прыйшла ў галаву дурная думка — спытаць у настаўніцы, ці сапраўды наш горад называўся калісьці Москва. Яна паглядзела на мяне як на хворага, і потым паўгадзіны распавядала, што ніколі гэткай назвы не было, што заўсёды расейскі народ імкнуўся ўзьяднацца зь ліцьвінскім народам, што ліцьвіны амаль 200 гадоў таму вызвалілі нас ад прыгнёту алігархаў, што калі б не яны, дык мы й сёньня размаўлялі б на дзікай расейскай мове і ня ўмелі б размаўляць прыгожа — па-беларуску, што ніколі не далучыліся б да эўрапейскае супольнасьці народаў і г.д. Потым яна спытала, адкуль я гэта ўзяў, але ў гэтую ж хвілю прагучаў званок.

12 ЛЮТАГА 2191 ГОДУ.

Урок літаратуры. Сяджу і ад нуды пішу гэты дзёньнік. Настаўніца распавядае пра клясыка ліцьвінскае літаратуры Багушэвіча. Мы яго ўжо два разы вывучалі ў малодшых клясах, і я ўсё добра ведаю.

15 ЛЮТАГА 2191 ГОДУ.

Прыходзіў дзед Ерафей. Ён спытаў, як я вучуся. Я сказаў, што вучуся добра і ўчора атрымаў «выдатна» па ліцьвінскай літаратуры. Дзед Ерафей гэта ўхваліў, а потым спытаў, што я ведаю пра літаратуру расейскую. Я адказаў, што зараз у школе нам дазволена не вывучаць расейскую літаратуру (бо сапраўды, каму яна патрэбная?).

23 ЛЮТАГА 2191 ГОДУ.

Бачыў на вуліцы гурток людзей; яны размаўлялі па-расейску і, што самае сьмешнае, гаварылі ня «мова», а «язык»! Яны стаялі ля ўваходу ў кінатэатар «Вільня» з плякатам, на якім было напісана: «На гэтым месцы да 1997 году стаяў старажытны будынак маскоўскага Крамля». Адна жанчына падышла да іх і стала ганіць: «Ну, дык што з таго?» — а яны адказалі, што нібыта гэты будынак зруйнавалі Беларусы. І чаго ім не сядзіцца, гэтым «сознательным»?

24 ЛЮТАГА 2191 ГОДУ.

Сёньня на палітінфармацыі настаўніца сказала, што актывізаваліся расейскія нацыяналісты, але журналістка Т.Папернік на старонках «Вечаровай Масквы» дала ім жару. Потым усе ўголас чыталі гэты артыкул, але я вырашыў абавязкова спытаць у дзеда Ерафея, што гэта за нацыяналісты такія і чаго яны хочуць. Калі я прыйшоў дадому, бацька гутарыў з маці наконт таго, ці не зьмяніць нам прозьвішча «Івановы» на «Янкоўскія», бо на працы з бацькі сьмяюцца. Нарэшце было вырашана прозьвішча зьмяніць, але я сказаў, што Янкоўскім ня буду, бо ў нашай клясе ўжо ёсьць чатыры Янкоўскія.

26 ЛЮТАГА 2191 ГОДУ.

У школе загадалі напісаць даклад па гісторыі на тэму: «Барацьба Вялікага князя Літоўскага Вітаўта за вызваленьне расейскага народу ад прыгнёту маскоўскіх фэадалаў». Зараз сяджу і ня ведаю, з чаго пачаць. Прагледзеў падручнік. Пра Вітаўта там шмат чаго ёсьць, а пра расейскі народ — нічога. Не забыцца патэлефанаваць дзеду Ерафею.

На гэтым месцы ў нататках — вялікі перапынак. Апошні запіс датуецца 4 жніўня 2191 году. Ён складаецца ўсяго з трох словаў: «ДА ЗДРАВСТВУЕТ РОССИЯ!» ■

Фота Анатоля Клешчука

Мядзельская Кальварыя

БЕЛТУР тэл. (017) 216-99-90, 216-99-68, 216-95-31. вул. Альшэўскага 24, п.408

БЕЛАРУСЬ
д/а «Нарач», т/г «Нарач», п. «Спутнік», п. «Журавушка»;
Дом творчасьці пісьменьнікаў *«Іслач» (Ракаў);*
Браслаўскія вазёры: *б/а Слабодка (катэджы), б/а «Дрывяты» (эўракорпус)*

ЛІТВА, ЛАТВІЯ, ЭСТОНІЯ
Візавая падтрымка

ДА ЦЁПЛАГА МОРА!
Кіпр, Эгіпэт, ААЭ, Таілянд, Туніс, Гішпанія

ЗША
Адпачынак у Маямі

ПАРЫЖ, ЛЁНДАН
(авія, Менск)

ліц. № 561/3 ад 9.9.1998 г. да 9.9.2000 г. МСТРБ

НАША НІВА КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. 220050, Менск, а/с 537

Тэкст _____

_____

Імя і прозьвішча _____

Адрас, тэлефон _____

прыватныя абвесткі

«Радзіма альбо сьмерць!» Абірай Радзіму — ідзі ў «Белы Легіён». Пэйджэр: 278-11-01, абанэнт 4979

Тэрмінова за плату неабходны на час вінчэстэр Фуджыцу 6,51 Гб, мадэль МРС 3065 АН. Т.: 234-79-17 (Сяргей) і 249-08-88 (Віталь)

Шырокі выбар запісаў беларускай музыкі (рок, поп, джаз, бардаўская, гітарная і клясычная музыка). 220085, Менск, а/с 5. Т.: 249-08-88 (Віталь)

Малады Фронт запрашае беларускую моладзь на свае паседжаньні шточацьвер а 19-й: Менск, Варвашэні 8. Т.: 284-50-12. Тэлефануйце, прыходзьце, пішыце

У Маладэчне ў офісе ТБМ (Б.Хмяльніцкага 10 — інтэрнат Палітэхнікуму, паверх 3) пачынае працаваць выстава беларускіх касэтаў. Прыходзьце штосераду і чацьвер з 17 да 19

Набуду з удзячнасьцю Статут ВКЛ 1588 г. Т.: 274-73-75, Валянціна

Відэа «Пяты элемэнт» (ЗША), «Салодкі яд каханьня», «Сьлёзы блуднага сына» (Беларусь). Падпіска на «Адважнае сэрца». 220107, а/с 150. Т.: 240-78-01, 213-43-52 (Станішэўскі Віталь)

Набуду кнігу М.Мушынскага «Якуб Колас: Летапіс жыцьця і творчасьці». Т.: 262-67-02, Валянцін

Аленка Еўдакімава, я цябе кахаю! Са сьвятам! Алег Пілінчык

Каму ў Берасьці патрэбныя беларускія аўдыёкасэты, зьвяртайцеся: 24-54-56, Сяржук

Дарагая сяброўка Ленік Ш. Вельмі сумую і чакаю твайго ліста. Можа ты не атрымала майго? Ганна

Прадаю калекцыю фірмовых аўдыёкасэтаў гурта «Nirvana». Танна, гуртом таньней. Т.: 271-23-49, Яраслаў

Міцькі зычаць дэбатэрам посьпехаў у працы. Удалага вам кейсу!

Цікавы мянчук шукае актыўных прыхільнікаў аральнага сэксу, пажадана ваякаў! А/с 78, 220141, Менск

Віншую любую з Днём нараджэньня! Зычу здароўя, шчасьця, моцнага каханьня! Твая сям'я Давідовічаў

Спадар Мікола, з Днём нараджэньня віншую Вас! Шчаснасьць, дабрыня і радасьць — Вам заўсёдныя спадарожніцы. Надзея Малышава

Віншуем Міколу Дзяміда, выкладчыка Тэхналягічнага Ўнівэрсытэту і найпаважанага чалавека, з Днём нараджэньня. Радасьць духу ёсьць сьведчаньне яго моцы. Р.Эмэрсан

Сардэчныя віншаваньні з нагоды Дня народзінаў Дзяміду Міколу! Хай будзе пашана ўсім змагарам за нашу незалежнасьць!

Малады Фронт Мастоўшчыны віншуе **Зарэмбюка Алеся** і **Сімончыка Валер'я** зь Перамогай

Вітаю вызвольны рух Беларусі! **Сяржук Папоў** з Бабруйску, патэлефануй Алесю з Мастоў

Змагары за родную бацькаўшчыну! Адгукніцеся! Дзякуй БПС за канэрту. 223710, Салігорск, вул. Багамолава 24-209, Раману

Эдвард, мілы, я вельмі-вельмі Вас кахаю! Дзякуй за тое, што Вы ёсьць!!!

Сп.Мілкоўскаму! Чытаць свае творы і млець — то лепш, чым нічога ня ўмець! Чытач

...таўро ганьбы кладзецца на нашае нацыянальнае імя. В.Ластоўскі

Прапануем в/а працу ў хаце (250 у.а.). Гэта Вы можаце! Укладзіце 2 канэрты (адзін са зв/а) + купон б/а: 220089, Менск-89, а/с 122

Віншую Ганулю з Днём народзінаў! Хай усё будзе, як пажадаеш! Хай жыве краіна крывавых дажджоў! Ленік

А ці ведаеш, Алег, галоўнага вачамі ня ўбачыш, пільнае толькі сэрца? Алена

Прывітаньне берасьцейскай «Вежы». Мясцовыя МФаўцы

Прыхільныя ды цікаўныя да беларускага паганства й сьветапогляду запрашаюцца да ліставаньня. 220086, Менск, а/с 121

Годзе ствараць арганізацыі «барацьбы» ў замежжы. Вяртайцеся ды пакажыце, чаго вы вартыя!!! Крывіч

Фэны «КВ»! Лепей не выходзьце на вуліцы Менску. Хавайцеся ў бульбу! SK

Калі б мы ведалі ўсе дробязі жыцьця якой-небудзь казюлькі, мы шмат якіх памылак не зрабілі б. Паважайце Гісторыю!

Прапануем в/а працу з інфармацыяй у хаце (150 у.а.) Ад Вас — канэрта са зв/а + купон б/а. 213828, Магілёўская вобл., Бабруйск, а/с 22

Каму патрэбны раскол ліцьвінскага руху?! Мы былі ад пачатку, і больш нікога. Думай, выбірай! А/с 124, 246012, Гомель

Запрашаем ліцьвінаў да згуртаваньня. Пагоня чакае цябе! А/с 124, 246012, Гомель

Фэн-клюб гурта «Камэлот» прымае заяўкі на атрыманьне другога альбому. Ад Вас — канэрта са зв/а. 220117, Бялецкага 32-82, Менск, тэл.: 274-58-08

Наша Ніва 90 гадоў таму

Курган

5 лістапада 1909 году

М.Валожын, Менск. губ. Ашмянск. пав. На ўсходняй часьці нашага мястэчка ёсьць ладны ўзгорак, на якім жыве, пасяліўшыся, бацюшка; гэты ўзгорак пачынаецца ад мястэчка агародам, а канчаецца невялікім курганом памеж дзьвюх дарог і там, як відаць, былі некалісь могілкі. Якія яны былі, аб гэтым ніхто з нашых старых ня помніць, і нямашака ніякага аб іх успамінку. Цяпер зямля пакрысе абваліваецца, і адтуль выпадаюць людзкія косьці: галёнкі, скабы і чэрапы, і валяецца гэта ўсё па дарозе, дзе ходзяць і езьдзяць людзі і ганяюць скаціну. Смутны і прыкры гэта выгляд, каб гэтак людзкія косьці валяліся ў паняверцы. Ці мы гэтак крэпка зьдзічэлі, ці гэта праклятая цемната пазасланяла нам вочы, што мы ня можам праглянуць на сьвет Божы? Ці ж гэта ўжо ня знойдзецца ў нас добрага чалавека, каторы б заняўся гэтай справай? Тут ня трэба вялікага кошту і трудоў, тут трэба толькі добрай ахвоты. Сьпярша трэба пазьбіраць і пазакопваць у зямлю косьці, і аблажыць дзёрнам з бакоў гэты курганок, і хаця крыху абгарадзіць, хоць бы па тры плацінкі, каб скаціна не абсосвала дзёрну, пакуль ён не зрасьцецца, вось і ўсё! Наш беларускі народ мае добрае сэрца, але немаш гэта добрага даводу; ён прывыкшы, каб яго папхнуць, панукаць, а тады ён з усяе сілы. Хоць са стыдом трэба прызнацца, што на добрыя рэчы трэба прынукі, а на благія, дык людзі самі ліпнуць як мухі да мёду. Калі ў нас задумалі адкрыць гарадзкое вучылішча, і на гэта трэ было 500 рублёў грошай, дык іх зьбіралі, зьбіралі, ды далі спакой, а як быў у нас у Валожыне на Пранцішка кірмаш, дык нашы дзьве казённыя манапольні таргавалі чуць не паўтары тысячы рублёў у адзін дзень. А трэба ведаць, што ў нас гэтакіх вялікіх кірмашоў у гаду пяць і што кожны чацьвер — торг, дзе за п'янымі няма як павярнуцца.

Стары Ўлас

Ірачка Тоўсьцік, каханьне маё!
Выздароўлівай хутчэй, я цябе зачакаўся!
Твой Šydloŭski

паштовая скрынка

Людміле Г. *Нельга апісваць адчуваньні. «Страшэнная па сваёй безвыходнасьці думка, што ўсё дарэмна» насамрэч ня страшыць. Назыўны гэты фаталізм не праймае. Праўдападабенства вобразу будуецца на ўскосных доказах, а не на беспадстаўных прысудах. Не скажыце мне, што я злачынца, а дакажыце мне гэта — каб я Вам паверыў.*

Яўгіньні К. *Тое самае. Прыгожая назва пераважвае ўвесь твор. Паспрабуйце напісаць не абразок, ня прыпавесьць, не імпрэсію, а апавяданьне, «банальнае, як сьмерць селяніна».*

Ш.У., Гарэзьліваму Сяргею. *На жаль, неарыгінальна.*

Францішку зь Нясьвіжу. *Тое самае. Лепш бы Вы напісалі ад імя таго, каго пабачылі ў засьнежаным полі з вакна начнога аўтобуса. Тым больш, што «лепей адзінота ў полі, чым адзінота ў натоўпе».*

«Наша Ніва» незалежная газэта, заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991. Галоўны рэдактар Сяргей Дубавец. Рэдактар выпуску Андрэй Дынько. Мастацкі рэдактар Сяргей Харэўскі. Адказны сакратар Аляксандра Макавік. Дызайн-макет Лявон Раманчык. Набор Насты Дзядзенкі. Выдавец: рэдакцыя газэты «Наша Ніва». Заснавальнік Павал Жук. Адрас для допісаў: 220050, Менск, а/с 537. Tel/fax: (017) 227-78-92. E-mail: niva@user.unibel.by Http://members.xoom.com/Nasa_Niva.

© НАША НІВА. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.

Наклад 3068. 6 палос фарматам А2. Нумар падпісаны ў друк 3:24, 08.11.1999. Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, праспэкт Францішка Скарыны, 79. Замова № 5702. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4-га ліпеня 1996 г., выдадзенае Дзяржаўным камітэтам па друку Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, пр. газэты «Известия», д. 8, кв. 173.
М123456789101112
П123456789101112